Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 ЛІПЕНЯ 2016 г. СУБОТА № 131 (28241)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Сяброўства з вучнямі ў сацсетках

СТАР. 7



Прэм'ера ў РТБД

СТАР. 8



Рэпартаж з папраўчай калоніі

СТАР. 10-11

ЦЫТАТА ДНЯ



**Раіса СІДАРЭНКА, намеснік міністра адукацыі:**

*«Асноўная задача, якая традыцыйна стаіць перад намі, — забеспячэнне якасці адукацыі. Яна шматаспектная і патрабуе ўдзелу ў яе рэалізацыі і навуковых работнікаў, і метадыстаў, і настаўнікаў-практыкаў. Яна ўключае ў сябе якасныя навуковыя распрацоўкі ў сферы адукацыі, адбор зместу, стварэнне навучальных праграм, якія аптымальна спалучаюць у сабе навуковы падыход, даступнасць і арыентаванасць на практыку: падрыхтоўку навучальных дапаможнікаў, метадычна граматных, даступных, зразумелых вучню; метадычнае і псіхолага-педагагічнае суправаджэнне адукацыйнага працэсу і прафесійную кампетэнтнасць педагога».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.07.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 2,0124 | ▲ |
| Еўра | 2,2279 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0313 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0810 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# «Модны прысуд» бабы Франі



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Перад першай сядзібай вёскі Брыялёва, калі ехаць з райцэнтра Беразіно, заўсёды «людна». Кожны, хто першы раз праязджае праз гэты населены пункт і бачыць незвычайную «грамаду» каля плоту, абавязкова спыняецца, узіраецца ў «постаці» і ў «аблічча», дастае тэлефон альбо фотаапарат (кажу пра сябе) і пачынае здымаць фота на памяць. На тварах чытаецца ўсмешка і здзіўленне: з якой нагоды і хто прыдумаў усю гэтую гратэскную экспазіцыю? Найбольшае здзіўленне выклікае тое, што «людзей» зрабіла і выстраіла каля плота пенсіянерка. Сёлета аўтарцы своеасаблівага лялечнага тэатра Франі Іванаўне Сушынскай 75 гадоў.

Творчая натура бабы Франі праявілася яшчэ ў тыя часы, калі яна працавала лесніком. Каб на агарод з бульбай у лясным надзеле не наведваліся дзікі, жанчына зрабіла некалькі пудзілаў у натуральную велічыню — прататыпамі герояў быў вясковы люд, суседзі, нават свой аўтапартрэт Франя змайстравала. Сапраўды, дзікі больш не паказвалі свае лычы на яе лясных сотках. Баба Франя прыгадвае: «Іншы аднойчы нашы жанчыны ў лес па ягады, убачылі мой «аўтапартрэт», падумалі, што гэта я і сталі клікаць: «Франя, Франя!..»

СТАР. 12

■ Руплівым гаспадарам

## ДЗЕ ПАСЕЕШ ГУСТА, ТАМ НЕ БУДЗЕ ПУСТА

### Што расло ў агародах нашых прабабуль?

**Займацца агародніцтвам на Беларусі пачалі яшчэ ў III тысячагоддзі да нашай эры. Пры раскопках паселішчаў ранняга жалезнага веку былі знойдзены зярняты гароху, вікі, бабы. Цікавыя звесткі пра развіццё агародніцтва захоўваюць стражытныя акты, летапісы, хронікі XVI—XVIII стагоддзяў.**

**— Актавыя матэрыялы паказалі, што многія культуры, якія сеюць цяпер, былі вядомы ў тыя часы. Буракі і капуста на нашай зямлі вырошчваюцца тысячагоддзямі. Напэўна, многія культуры прыйшлі сюды ад грэкаў, лічыцца, што іх прынеслі праваслаўныя святары, — расказвае вядучы навуковы супрацоўнік аддзела народазнаўства Цэнтра даследавання беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, доктар гістарычных навук Любоў РАКАВА. Этнограф займалася даследаваннем аднаго са старажытных заняткаў беларусаў, прычым разглядала гэту тэму ў сацыяльным аспекце, высвятляла, якія культуры вырошчвала шляхта, сяляне, гараджане.**

СТАР. 13

■ Абеліскі параненай зямлі

## НЕВЯДОМЫ САЛДАТ ДЗЯДЗЬКА ВАНЯ

**Пляменніца савецкага воіна прыехала з Сібіры ў Беларусь на магілу свайго продка, якая да нядаўняга часу лічылася безыменнай**

**На днях на аднаго невядомага салдата стала менш. Праз 72 гады пасля гібелі малодшага лейтэнанта Івана Кутушнікава яго сваякі адшукалі магілу продка. Каб пакланіцца зямлі, дзе праз чатыры дні пасля вызвалення Мінска — 7 ліпеня 1944 года — загінуў дзядзька Ваня, яго пляменніца пераадолела амаль 4,5 тысячы кіламетраў...**

### Страчаныя дакументы

— У нашай сям'і заўсёды захоўвалася гісторыя пра тое, што дзядзька Ваня, а для бабулі і маёй маці проста Ваня, загінуў у 1944 годзе пры вызваленні Мінска, — гаворыць Таццяна Весніна. — Але ўсё гэта было на ўзроўні вусных аповедаў. Дакументаў, якія маглі б пацвердзіць гэты факт, у нас не захавалася. Была пахаванка, але, каб атрымліваць дапамогу за загінуўшага сына, мая бабуля, маці Івана Васільевіча, аддала яе ў сельскі Савет.

СТАР. 4



**Браты Іван і Пётр Кутушнікавы падчас сустрэчы на фронце. Кастрычнік 1943 года.**

■ Выбары–2016

# ПАЛІТЫЧНАЯ БАРАЦЬБА БУДЗЕ ВОСТРАЙ

**Такую думку выказала старшыня Цэнтрвыбаркама Беларусі Лідзія Ярмошына падчас тэлезвароту на інтэрнэт-партале «Выбары-2016» (vybory2016.by), падводзячы вынікі чарговага этапу выбарчай кампаніі.**

«Калі казаць пра актыўнасць палітычнай барацьбы, то, мяркуючы па актыўным удзеле партый у працэсе вылучэння, асабліва тых партый, што адносяць сябе да апазіцыйнага лагеру, можна меркаваць, што палітычная барацьба будзе даволі вострай», — адзначыла яна.

Лідзія Ярмошына дадала, што на вечар 7 ліпеня яшчэ не было вядома дакладнай колькасці ўчасткаў для галасавання, якія будуць утвораны. Аднак мяркуецца, што іх будзе каля 6 тысяч на тэрыторыі краіны і каля 40 адзінак за яе межамі пры дыпламатычных прадстаўніцтвах Беларусі. Мінімальная колькасць выбаршчыкаў, якія пражываюць на ўчастку для галасавання, — 20, максімальная — 3 тысячы чалавек.

У дзесяцідзённы тэрмін пасля стварэння ўчасткаў для галасавання, якое завяршылася 8 ліпеня, выканаўчыя камітэты і мясцовая адміністрацыя ў гарадах павінны даць паведамленні ў газеты з мэтай праінфармаваць выбаршчыкаў і палітычныя партыі аб межах і нумарацыі ўчасткаў для галасавання. Далей пачнецца вылучэнне прадстаўнікоў ва ўчастковыя выбарчыя камісіі.

Лідзія Ярмошына таксама падкрэсліла, што працэс вылучэння праходзіць у рабочым парадку, а тыя скаргі, якія звязаны з работай выбарчых камісій, аператыўна разглядаюцца і па іх даюцца законныя і абгрунтаваныя адказы. Акрамя таго, у краіне акрэдытавана 32 міжнародныя назіральнікі. Усе яны прадстаўляюць Садружнасць Незалежных Дзяржаў, куды ўваходзіць прадстаўнікі як Выканкама СНД, так і Міжпарламенцкай асамблеі СНД, а таксама Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*Kryzhevich@zviazda.by*




# ЛЕТА КАМПАНІІ НЕ ПЕРАШКОДЗІЦЬ

**На Гомельшчыне старшыня Цэнтрвыбаркама Беларусі Лідзія Ярмошына правяла семінар-вучобу членаў акруговых выбаркамаў вобласці. Размова ішла пра падрыхтоўку і правядзенне выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу шостага склікання:**

— Арганізацыя выбараў у рэгіёне традыцыйна знаходзіцца на вельмі высокім узроўні. На семінары галоўная ўвага — адкрытасці работы выбарчых камісій і празрыстасці рашэнняў, якія ёй прымаюцца. Мы пайшлі насустрач АБСЕ, стварылі ў нашых рэкамендацыях палажэнні, якія адсутнічаюць у законе. Напрыклад, адкрытасць працэсу падліку галасоў. Журналісты прысутнічалі пры адкрытай працэдуры ўтварэння акруговых і тэрытарыяльных выбарчых камісій. Такія ж рэкамендацыі тычацца ўчастковых выбарчых камісій, якія трэба стварыць да 27 ліпеня.

Лідзія Ярмошына адзначыла, што ў назіральнікаў ёсць магчымасць прысутнічаць не толькі падчас правядзення галасавання на пасяджэннях камісій, але і, напрыклад, падчас працэдуры перадачы пратаколаў ад участковых камісій акруговым выбарчым камісіям. І, зразумела, назіраць за вядзеннем перадвыбарнай агітацыі і прапаганды.

Магчыма, па прычыне летняга сезона збор подпісаў будзе ажыццяўляцца з цяжкасцю, бо многія адпачываюць на дачах ці знаходзяцца ў водпусках. Але Лідзія Ермошына не лічыць, што гэта крытычна адаб'ецца на сітуацыі са зборам.

— Кандыдаты моцныя і вядомыя абавязкова змогуць вылучыцца. Таму што ў іх заўсёды ёсць запасныя варыянты. Калі гэта кандыдат не ад палітычнай партыі, яго падтрымае працоўны калектыў. Калі моцны кандыдат ад партыі, то сабраць подпісы дапаможа партыя. Магчыма, будзе не па сем патэнцыяльных кандыдатаў у дэпутаты па акрузе, што зашмат, а па чатыры. Але гэтай колькасці таксама дастаткова для правядзення выбараў. З іншага боку, летнія месяцы, асабліва калі няма спякоты, — гэта спрыяльны час для збору подпісаў і правядзення вулічных мерапрыемстваў. Паколькі датэрміновае галасаванне будзе праходзіць у верасні, узнікае пытанне, дзе будуць галасаваць першакурснікі. Яны павінны будуць вярнуцца на месцы жыхарства і прагаласаваць там, бо на той момант яшчэ не будуць зарэгістраваны па месцы вучобы. Мы не можам уключыць у спісы выбаршчыкаў, у якіх адсутнічаюць звесткі пра рэгістрацыю.

На 7 ліпеня на Гомельшчыне зарэгістравана 37 ініцыятыўных груп. Пададзена 56 заяў пра рэгістрацыю ініцыятыўных груп грамадзян па зборы подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку асоб, прапанаваных для вылучэння кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

## Зоймемся здабычай выкапняў?

**У Мінску на сустрэчы дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў з дэлегацыяй Даследчага інстытута заканадаўства пры Пастаянным камітэце Нацыянальнага сходу В'етнама абмяркоўваўся шырокі спектр пытанняў, якія тычыўся міжпарламенцкага супрацоўніцтва, асабліва ў заканатворчага працэсу ў Беларусі, а таксама аб пашырэнні кааперацыі ў вытворчай сферы.**

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах, кіраўнік рабочай групы Нацыянальнага сходу Беларусі па супрацоўніцтве з Парламентам В'етнама Віталь БУСЬКО** адзначыў, што міжпарламенцкія кантакты з В'етнамам праходзяць на высокім узроўні. Гэта становіча адлюстроўваецца і ў сумесный працы па міжнародных пляцоўках. Сёння перад дзвюма краінамі стаіць задача да канца 2017 года дасягнуць узроўню ўзаемнага гадавога тавараабароту ў 500 млн долараў. Для гэтага парламентарыям неабходна стварыць камфортны клімат для прадстаўнікоў прамысловага і дзелавога сектараў. Абодва бакі намецілі шэраг кірункаў па нарошчванні кааперацыі. Парламентарыі нашай краіны прапанавалі сумесную здабычу карысных выкапняў у Лаосе, Камбоджы, М'янме і Тайландзе. **Старшыня Камітэта па заканадаўстве Нацыянальнага сходу В'етнама Фан ЧУН ЛІ** выказаў зацікаўленасць у развіцці гэтага кірунку, як і супрацоўніцтва ў навуковай сферы. Акрамя гэтага, прадстаўнікі в'етнамскай дэлегацыі цікавіліся палітыкай прыцягнення прамых замежных інвестыцый у Беларусь, а таксама тым, якія перспектывы адкрываюцца для інвестараў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*Kryzhevich@zviazda.by*

■ Клопат пра людзей

# НЕАДЗІНОКІЯ СТАРЫЯ,

## або Дзяржава гарантуе сацыяльную падтрымку



**У 2013 годзе ўступіла ў сілу новая рэдакцыя закона «Аб сацыяльным абслугоўванні». Але жыццё не стаіць на месцы. Павялічваецца сярэдняя працягласць жыцця беларусаў, расце колькасць пажылых людзей — значыць, трэба прымаць дадатковыя захады па павышэнні якасці жыцця прадстаўнікоў старэйшага пакалення, падтрыманні іх актыўнага даўгалецця.**

**Заканадаўства — гэта дынамічная сістэма, якая павінна своечасова рэагаваць на змену ўмоў. Таму ў мэтах далейшага развіцця сістэмы сацабслугоўвання сёлета запланавана ўнясенне змяненняў у гэты закон. Размова пра гэта ішла на «круглым стале» «Закон Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльным абслугоўванні»: правапрымяняльная практыка, праблемы і напрамкі ўдасканалення».**

Як бы ні складвалася сітуацыя ў эканоміцы, падтрымка людзей і сем'яў, якія апынуліся ў складанай жыццёвай сітуацыі, застаецца адным з галоўных прыярытэтаў дзяржавы. Згортваць сацыяльныя праграмы ў краіне не плануецца. Сацыяльныя стандарты ў дачыненні да сацыяльна ўразлівых катэгорый насельніцтва будуць захаваны. Пра гэта заявіў на «круглым стале» **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.**

Ён адзначыў, што комплексная нарматыўная прававая база ў сферы сацыяльнага абслугоўвання ў Беларусі адпавядае сусветным стандартам. Але з часам паступаюць новыя прапановы і ініцыятывы. Таму важна карэктаваць закон аб сацабслугоўванні для забеспячэння даступнасці і павышэння якасці сацпаслуг, задавальнення патрэбы людзей у сацабслугоўванні.

Пры гэтым Міхаіл Мясніковіч упэўнены, што неабходна стымуляваць арганізацыі і прадпрыемствы рознай формы ўласнасці аказваць падтрымку ў рэалізацыі сацыяльных праектаў і ініцыятыў. Дзяржава, паводле яго слоў, працягне выконваць свае сацыяльныя абавязацельствы, але разлічвае на пашырэнне партнёрства з грамадствам і бізнесам у гэтым пытанні.

Міхаіл Мясніковіч таксама ўпэўнены, што нельга дапусціць, каб сем'і перакладалі клопат аб сваіх блізкіх цалкам на плечы дзяржавы. «Нельга, каб у грамадстве існавала думка, што гэта справа выключна дзяржавы. Быць абыякавымі да лёсу людзей, якія праз узрост, хваробы аказаліся недзеяздольнымі або часткова страцілі дзеяздольнасць, — гэта не ў нашай беларускай ментальнасці», — заявіў спікер.

Не абышоў увагай старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу і пытанні заработнай платы работнікаў устаноў сацыяльнага абслугоўвання, адзначыўшы, што тут патрэбны дадатковыя меры сацыяльнай падтрымкі і стымулявання.

На сёння, па словах **міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Марыяны ШЧОТКІНАЙ,** у нашай краіне створаны поўны цыкл сацыяльнага абслугоўвання.

Так, калі чалавек у гадах ужо не ў стане абслугоўваць сябе цалкам, ён можа звярнуцца ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва па месцы жыхарства. Там яму прапануюць два віды дапамогі: разавыя сацыяльныя паслугі (вымыць акно, ускапаць агарод) або рэгулярную дапамогу сацыяльнага работніка. Прычым паслугі, гарантаваныя дзяржавай, чалавек можа атрымаць усюды, у якім бы месцы нашай краіны ён ні пражываў.

Калі пажылы чалавек стаў адчуваць сябе горш, але не хоча пакідаць родны дом, яму прапаноўваюць нестацыянарнае абслугоўванне. Яго можа абслугоўваць сацработнік на даму, альбо некалькім пажылым людзям прапануецца з'ехацца і жыць разам у адным доме і разам весці гаспадарку, а тэрытарыяльны цэнтр сацабслугоўвання насельніцтва аказвае ім усю неабходную дапамогу і падтрымку.

Калі старому чалавеку з цягам часу стала яшчэ больш складана даглядаць сябе — ён можа звярнуцца ў аддзяленне кругласутачнага знаходжання. Такія аддзяленні створаны па ўсёй краіне, усяго іх на сёння — 63. Пры неабходнасці ў іх можна знаходзіцца ад аднаго да шасці месяцаў, на ўмовах аплаты або частковай аплаты, у залежнасці ад сітуацыі. Калі ж чалавек ужо не ў стане жыць адзін, ён трапляе ў стацыянар.

Сацыяльныя паслугі сёння даступныя для любога, хто мае ў іх патрэбу. Пры гэтым, паводле слоў Марыяны Шчоткінай, калі гаворка ідзе пра даступнасць сацыяльнага абслугоўвання, маецца на ўвазе не толькі даступнасць устаноў, якія аказваюць такія паслугі. Не менш істотны момант — нізкі кошт сацыяльных паслуг у нашай краіне. Так, дапамога сацыяльнага работніка сёння каштуе ад 35 да 50 капеек у гадзіну ў залежнасці ад рэгіёна (ад 3,5 тыс. да 5 тыс. рублёў на «старыя» грошы). Такім чынам, калі сацыяльны работнік прыходзіць да пажылога чалавека 5 разоў на тыдзень на 2 гадзіны, то ў месяц яму прыйдзецца заплаціць усяго 30 рублёў (300 тыс. руб. па-старому). Пры гэтым сярэдняя пенсія складае больш за 2990 рублёў (раней шыя 2,9 млн рублёў).

Сапраўдным прарывам у сістэме сацыяльнага абслугоўвання Марыяна Шчоткіна назвала аддзяленні дзённага знаходжання для інвалідаў.

— Калі мы толькі іх адкрывалі, скептыкі сцвярджалі, што нічога ў нас не атрымаецца. Людзі з абмежаванымі магчымасцямі складана ідуць на кантакт. Аднак мы выбралі правільны шлях — сталі працаваць не толькі з дзецьмі, але і з іх бацькамі. У выніку сёння наш вопыт ужо пераймаюць Казахстан і Расія, — сказала яна. — Нашы дзеці-інваліды ўдзельнічаюць у турыстычных злётах, гуляюць у футбол, перамагаюць у міжнародных конкурсах...

Асноўнай задачай міністр назвала стварэнне канкурэнтнага рынку сацыяльных паслуг, каб чалавек мог выбраць арганізацыю, якая будзе прадстаўляць яму той ці іншы від абслугоўвання. З гэтай мэтай Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны падрыхтаваны праект пастановы ўрада, накіраваны на ўдасканаленне механізму дзяржаўнага сацыяльнага заказу. Нагадаем, што сутнасць дзяржаўнага сацзаказу — прыцягненне юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў да аказання сацыяльных паслуг і рэалізацыі сацыяльных праектаў.

**Святлана БУСЬКО,**
*busko@zviazda.by*

■ Грошы

# ПЕРАХОД НА ДЫСТАНЦЫЙНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ

## А налета плануецца браць падатак і з мабільных праграм

**Пра гэта паведаміў першы намеснік міністра па падатках і зборах (МПЗ) Беларусі Ігар КЛЕПЧА. Ён адзначыў, што за апошнія гады сістэма падаткаабкладання ў краіне была істотна рэфармавана, бо колькасць плацяжоў паменшылася ў 12 разоў, а падатковая нагрузка — на траціну. Дарэчы, менавіта дадатковага спрашчэння падатковых працэдур патрабаваў днямі ад кіраўніцтва галіны Прэзідэнт.**

Ігар Клепча ўпэўнены, што праца ў гэтым напрамку будзе працягнута і далей. Сёння ўжо дзейнічае сістэма электроннага дэкларавання, якой карыстаюцца каля 300 тысяч падаткаплацельшчыкаў. Цяпер у інспекцыях ствараюцца спецыяльныя месцы для абслугоўвання кліентаў на адлегласці з выкарыстаннем сістэмы электроннай чаргі. Гэты метад дазволіць кліентам падаваць дэкларацыю, атрымліваць кансультацыі і ажыццяўляць іншыя адміністрацыйныя працэдуры. Сёлета першы такі цэнтр па абслугоўванні падаткаплацельшчыкаў будзе адкрыты на базе падатковай інспекцыі Маскоўскага раёна сталіцы. А ў наступным годзе такія цэнтры павінны з'явіцца ў кожным абласным цэнтры краіны.

### Афшоры не схаваюць

Ігар Клепча паведаміў, што цяпер МПЗ праводзіць актыўныя перамовы па далучэнні да шматбаковага міжнароднага пагаднення аб аўтаматычным абмене паміж падатковымі органамі звесткамі па фінансавых аперацыях. «Падобныя дакументы дазваляюць ажыццяўляць аўтаматычны абмен інфармацыяй аб замежных фінансавых рахунках па адзінай форме. У выніку такога абмену падатковыя органы атрымліваюць доступ да рахункаў, адкрытых плацельшчыкамі ў замежных фінансавых установах, а таксама да іншых фінансавых актываў, у тым ліку і ў афшорных зонах», — растлумачыў ён.

Ігар Клепча адзначыў, што на пачатак мая за далучэнне да гэтага пагаднення выказаліся больш за 80 дзяржаў. «Гэта дасць магчымасць павысіць эфектыўнасць кантрольных мерапрыемстваў па вызначэнні падатковых абавязацельстваў плацельшчыкаў і дазволіць спыняць схемы выводу рэзідэнтамі краіны капіталаў за мяжу больш аператыўна», — падкрэсліў намеснік міністра. Ён нагадаў, што ў апошні час усё часцей выкрываюцца факты незаконнага перамяшчэння плацельшчыкамі капіталу за мяжу або атрымання беларускімі грамадзянамі даходаў у іх за мяжой, якія знаходзяць адлюстраванне ў тым ліку і ў прэсе. «У сувязі з гэтым мы разумеем, што традыцыйнага абмену інфармацыяй з падатковымі органамі замежных дзяржаў, які працуе па прынцыпе запыт-адказ, ужо недастаткова. Таму і ўзнікла патрэба ў атрыманні інфармацыі без запыту ў аўтаматычным рэжыме.

### Мабільныя гульні — пад падатковы «каўпак»?

Услед за Расіяй і наша падатковая служба вырашыла разгледзець магчымасць спаганяць падатак з рэалізацыі мабільных праграм, гульняў і фільмаў. Гэтыя прапановы будуць ажыццяўляцца з дапамогай карэкціроўкі палажэнняў Падатковага кодэкса. «Першае, што мы будзем рабіць, гэта прызнаем месцам рэалізацыі такіх паслуг тэрыторыю Беларусі. А гэта значыць, што замежныя кампаніі, якія аказваюць іх, павінны будуць выконваць падатковыя абавязацельствы ў выглядзе вылічэння выплаты падатку на дабаўленую вартасць у нас», — растлумачыў сітуацыю **начальнік галоўнага ўпраўлення метадалогіі падаткаабкладання арганізацый Міністэрства па падатках і зборах Ігар СКРЫННІКАЎ**. Ён падкрэсліў, што гаворка вядзецца выключна аб ПДВ. Пры гэтым плануецца прымяняць стандартную стаўку ў 20%.

Цяпер гэта міністэрства сумесна з зацікаўленымі органамі прапрацоўвае механізмы найбольш аб'ектыўнага збірання ПДВ як непасрэдна з замежных кампаній, так і з беларускіх плацельшчыкаў, якія могуць выконваць падатковыя абавязацельствы за замежныя кампаніі. «Гэтыя прапановы будуць сістэматызаваны і накіраваны ў найбліжэйшы час у Мінфін для наступнага абмеркавання з усімі зацікаўленымі органамі. Мы спадзяёмся, што такая прапанова будзе падтрымана і знойдзе адлюстраванне ў Падатковым кодэксе з 1 студзеня 2017 года», — адзначыў Ігар Скрыннікаў.

Разам з тым, патлумачыў спецыяліст, ніхто не збіраецца такім чынам закрыць Беларусь ад усяго свету. Падатковае ведамства не зацікаўлена забараняць або абмяжоўваць што-небудзь. «Гэта даволі няпростае тэхнічнае рашэнне, і яно патрабуе адпаведных выдаткаў. З 1 студзеня не будзе ўведзена нейкіх вельмі жорсткіх, а тым больш абмежавальных мер. Мы зацікаўлены ў тым, каб усе як працавалі, так і працягвалі працаваць, але пры гэтым неабходна выконваць падатковыя абавязацельствы на тэрыторыі нашай краіны», — лічыць прадстаўнік МПЗ.

Ігар Скрыннікаў адзначыў, што прапрацоўкай гэтага пытання займаюцца многія краіны, у тым ліку Расія і ЕС. «Усе разумеюць, што даходы здабываюцца з тэрыторыі тых дзяржаў, якія з'яўляюцца спажыўцамі гэтых паслуг, а плацельшчыкі, як правіла, зарэгістраваны ў падатковых гаванях — там, дзе мінімальная стаўка падаткаабкладання. Беларусь зацікаўлена, каб падатковыя абавязацельствы ў частцы выплаты падатку на дабаўленую вартасць выконваліся на яе тэрыторыі», — удакладніў ён.

### Каля 4 тысяч сацыяльных утрыманцаў — пакуль...

Сёлета на экспертаў МПЗ ускладзены абавязак выявіць тых грамадзян, якія не ўдзельнічалі ў 2015 годзе ў фінансаванні дзяржаўных расходаў, паведаміла **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Ірына КРЫВАРОШЧАНКА.**

Да 31 мая 2016 года яны мелі права самастойна апавясціць падатковыя органы аб тым, што па выніках мінулага года не ўдзельнічалі ў фінансаванні дзяржвыдаткаў альбо ўдзельнічалі менш за 183 дні, каб потым да 1 ліпеня заплаціць адпаведны збор у памеры на 10% меншым за вызначаны заканадаўствам. Многія вырашылі заплаціць менш і загадзя. Было пададзена больш за 4 тысячы апавяшчэнняў, а ў выніку іх апрацоўкі грамадзянам прад'яўлена да аплаты звыш 10 млрд недэнамінаваных рублёў. Па стане на 8 ліпеня ў бюджэт ужо паступіла больш за 9 млрд «старых» грошай. На другім этапе падатковых утрыманцаў будуць выяўляць і накіроўваць ім паперкі да аплаты збору па фінансаванні дзяржвыдаткаў ужо ў поўным памеры. Сам збор неабходна будзе заплаціць да 15 лістапада.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■ Прававая гасцёўня

# ВЫНІКІ І ВЫГОДЫ ПЕРАПАДРЫХТОЎКІ,

## або Дыплом не заўжды азначае вышэйшую адукацыю

**У мяне дзве вышэйшыя адукацыі: эканамічная і юрыдычная і, адпаведна, два дыпломы — аб вышэйшай эканамічнай адукацыі і аб перападрыхтоўцы на базе вышэйшай адукацыі з прысваеннем кваліфікацыі «юрыст». Апошнія чатыры гады я працую намеснікам начальніка юрыдычнага ўпраўлення ў адной арганізацыі. Ці з'яўляецца мая юрыдычная адукацыя вышэйшай, і на якія пасады на падставе гэтага я магу прэтэндаваць, ці ёсць нейкія абмежаванні?**

**Галіна Іванаўна,** *г. Магілёў*

**На пытанне адказвае Яўгенія МІЦКЕВІЧ, кансультант упраўлення прававога рэгулявання сацыяльнай дзейнасці дзяржавы Галоўнага ўпраўлення нарматворчай дзейнасці ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва Міністэрства юстыцыі:**

У адпаведнасці з Палажэннем аб бесперапыннай прафесійнай адукацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, асваенне зместу адукацыйных праграм перападрыхтоўкі не дае вышэйшай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі па спецыяльнасці перападрыхтоўкі.

Акрамя таго, Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі рэгулююцца грамадскія адносіны ў сферы адукацыі, якія ўключаюць у тым ліку і адносіны па рэалізацыі права асоб на адукацыю, мэтай якіх з'яўляецца асваенне навучэнцамі зместу адукацыйных праграм.

У названым Кодэксе пералічаны шэраг дакументаў аб адукацыі, якія пацвярджаюць асваенне навучэнцамі зместу адпаведнай адукацыйнай праграмы. Дыплом аб вышэйшай адукацыі і дыплом аб перападрыхтоўцы на ўзроўні вышэйшай адукацыі вызначаны як розныя віды дакументаў аб адукацыі з адпаведнымі ім адукацыйнымі праграмамі.

Хачу звярнуць увагу, што рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, які праводзіць дзяржаўную палітыку ў сферы адукацыі, з'яўляецца Міністэрства адукацыі, а рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання, які займаецца пытаннямі ў галіне працы і занятасці насельніцтва, — Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Атрымаць найбольш дакладныя адказы на свае пытанні ў азначаных сферах грамадзяне могуць, звярнуўшыся ў гэтыя органы.

Кваліфікацыйныя патрабаванні (наяўнасць вышэйшай адукацыі, перападрыхтоўкі, стажу або іншага) да той ці іншай пасады служачага вызначаны ў адпаведных кваліфікацыйных даведніках (напрыклад, выпуск 1 Адзінага кваліфікацыйнага даведніка пасад служачых» «Пасады служачых для ўсіх відаў дзейнасці», зацверджаны пастановай Міністэрства працы Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 1999 г. № 159).

Каб прэтэндаваць на некаторыя пасады, патрабуецца наяўнасць вышэйшай прафесійнай адукацыі або вышэйшай адукацыі і праходжання адпаведнай перападрыхтоўкі.

Існуюць таксама асобныя катэгорыі служачых, на якіх распаўсюджваюцца нормы спецыяльных заканадаўчых актаў, што замацоўваюць іх прававы статус, бо гэта абумоўлена спецыфікай іх прафесійнай дзейнасці. Так, у адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, кандыдат на пасаду суддзі агульнага суда павінен, у тым ліку, мець вышэйшую юрыдычную адукацыю з прысваеннем кваліфікацыі «юрыст»

### Вас выслухаюць і дапамогуць

**Традыцыйна па суботах на прамой сувязі з насельніцтвам прадстаўнікі выканаўчай улады. 9 ліпеня з 9.00 да 12.00 на «прамых лініях» у рэгіёнах дзяжураць:**

**Брэсцкі аблвыканкам — намеснік старшыні КЛЕЦ Андрэй Анатолевіч.**
**Тэл. 8(016) 2213121**

**Віцебскі аблвыканкам — намеснік старшыні МАЦКЕВІЧ Алег Сяргеевіч.**
**Тэл. 8(021) 2222222**

**Гомельскі аблвыканкам — кіраўнік справамі КЛІЧКОЎСКАЯ Алена Уладзіміраўна.**
**Тэл. 8(023) 2751237**

**Гродзенскі аблвыканкам — кіраўнік справамі ПАПОЎ Ігар Андрэевіч.**
**Тэл. 8 (015) 2735644**

**Магілёўскі аблвыканкам — кіраўнік справамі ВАРОНІН Рыгор Аляксандравіч.**
**Тэл. 8 (022) 2501869**

**Мінскі аблвыканкам — намеснік старшыні СІРЭНКА Віктар Іванавіч.**
**Тэл. 8 (017) 5004160**

**Мінскі гарвыканкам — першы намеснік старшыні КУХАРАЎ Уладзімір Яўгеневіч**
**Тэл. 8 (017) 222 44 44**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### РЭЗЕРВЫ РАСТУЦЬ

**Аб гэтым паведамляе прэс-служба Нацыянальнага банка Беларусі. Паводле інфармацыі рэгулятара, па стане на 1 ліпеня золатавалютныя рэзервы нашай краіны ў вызначэнні Міжнароднага валютнага фонду павялічыліся на 42,6 млн долараў ЗША і склалі 4 млрд 314,2 млн долараў ЗША ў эквіваленце. У нацыянальным вызначэнні аб'ём золатавалютных рэзерваў павялічыўся яшчэ больш — на 174,4 млн долараў ЗША і па выніках чэрвеня склаў 4 млрд 791,5 млн долараў ЗША ў эквіваленце.**

Аналітыкі Нацбанка адзначаюць, што падтрыманню золатавалютных рэзерваў спрыяла паступленне сродкаў ад продажу Міністэрствам фінансаў і Нацыянальным банкам Беларусі аблігацый, якія намінаваны ў замежнай валюце, паступленні ад збірання экспартных пошлін на нафту і нафтапрадукты, купля Нацбанкам замежнай валюты на таргах Беларускай валютна-фондавай біржы, а таксама павелічэнне кошту золата на міжнародным рынку каштоўных металаў.

Адмоўны ўплыў на аб'ём золатавалютных рэзерваў у асноўным аказала пагашэнне ўрадам і Нацыянальным банкам краіны знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце ў поўным аб'ёме.

### БЕЗ АБМЕЖАВАННЯЎ

**За межы ЕАЭС у верасні можна выязджаць бязпошлінна часцей, чым раз на 8 дзён.**

Аб гэтым гаворыцца ў адпаведнай пастанове Саўміна ад 1 ліпеня, якая анулюе некаторыя папярэднія рашэнні ўрада. Сярод адмененых рашэнняў быў і дакумент «Аб некаторых пытаннях рэгулявання вывазу аўтамабільнага паліва з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь». Названая пастанова аб адмене абмежаванняў на паліва пры вывазе за мяжу ўступае ў сілу з 1 верасня, удакладнe навіну Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал.

Варта нагадаць, што агучанае абмежаванне было ўведзена ў Беларусі ў лістападзе 2011 года, калі пасля дэвальвацыі нацыянальнай валюты кошт паліва ў краіне ў дачыненні да іншых валют моцна знізіўся. Каб не дапусціць вываз таннага (у доларах) паліва за межы краіны і дзеля «стабілізацыі абстаноўкі ў пунктах пропуску праз дзяржмяжу Беларусі», улады прынялі шэраг мер. Тады выязджаць за межы Мытнага саюза на адным і тым жа аўтамабілі з Беларусі можна было адзін раз на 8 дзён. Калі за мяжу даводзілася выязджаць часцей, то неабходна было аплачваць пошліну на паліва.

З першых дзён восені гэтае абмежаванне адмяняецца, таму Дзяржаўнаму пагранічнаму і мытнаму камітэтам даручана забяспечыць прывядзенне сваіх нарматыўных прававых актаў у адпаведнасць з цяперашняй пастановай.

**Сяргей КУРКАЧ.**



### НЕБЯСПЕЧНАЕ АКНО

**Супрацоўнікі Следчага камітэта наведалі маці, чыё дзіця выжыла пасля падзення з 7 паверха. На шчасце, усё абышлося, дзяўчынка паправілася і ўжо дома.**

Пра той дзень, 3 мая, дзіця ўжо і не памятае, а вось матуля не забудзе ніколі. Алена — маці шасцярых дзяцей і дагэтуль не разумее, як такое магло здарыцца. Аднак следам адбыліся і іншыя выпадкі, з кожным з якіх следчыя разбіраюцца асобна. Супрацоўнікі кампаній па ўстаноўцы вокнаў нагадваюць, што любая маскітная сетка — ці то ралетная, ці то рамачная — не вытрымае вагу нават самага малога дзіцяці, бо яе задача — спраўляцца з насякомымі. Адным з добрых спосабаў і дзяцей зберагчы, і кватэру ахаладзіць — паставіць акно з сеткай на рэжым праветрывання. З такога становішча малым складаней за ўсё адчыніць акно. А яшчэ, вядома, з дзецьмі нельга расслабляцца і ленавацца тлумачыць, што можна, а чаго нельга. Для гэтага пажадана ўзяць малое за руку, паглядзець у вочы, перапытаць, ці зразумелі вас чалавечак.

«Напэўна, самае меншае, што мы маглі зрабіць, — гэта пастарацца дапамагчы з пытаннямі бяспекі шасцярых дзяцей, якіх выхоўвае жанчына, — кажа афіцыйная прадстаўніца Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь Юлія Ганчарова. — Таму і ўручылі камплект спецыяльных прылад на ўсе вокны ў кватэры».

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# НЕВЯДОМЫ САЛДАТ...

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Быў страчаны і яшчэ адзін дакумент, які сведчыў пра тое, дзе і пры якіх абставінах загінуў чырвонаармеец з сібірскага сяла Троіцкае, што ў Алтайскім краі. Адразу пасля пахаванкі маці Івана Кутушнікава атрымала два лісты. Адзін з іх — напісаны яшчэ жывым сынам — захаваўся. У ім Іван Кутушнікаў (сам яшчэ не ведаючы, што апошні раз) пісаў, што іх вайсковае падраздзяленне, нумар якога быў старанна выкраслены ваеннай цэнзурай, наступае. Такім жа чынам адсутнічалі ў тым лісце імёны камандзіраў, назвы тэхнікі... Гэта ўжо пасля вайны, дзякуючы архіўным звесткам, сям'я даведаецца, што малодшы лейтэнант Іван Кутушнікаў быў камандзірам самаходнай установкі Су-85 1446-га самаходнага артылерыйскага палка 29-га танкавага корпуса.

Другі ж ліст — у дадзеным выпадку найбольш каштоўны — быў страчаны пры невядомых абставінах. У ім, звяртаючыся да маці забітага вайскоўца, аднапалчане ў падрабязнасцях апісвалі апошні дзень савецкага артылерыста. Аказалася, што Іван Кутушнікаў загінуў ад кулі снайпера. Ехаў на брані, адкуль яго «зняў» нямецкі салдат. Сям'я паверыла ў гэтую легенду, бо, акрамя аповедаў бабулі, ніякіх іншых пацверджанняў факта не было.

## Магіла без імені

Але так было літаральна да апошніх дзён. Аказваецца, у аграгарадку Крэва, што пад Смаргонню, гісторыя пра савецкага салдата, які загінуў ад варожай кулі, перадавалася з пакалення ў пакаленне. Больш за тое, адзін з мясцовых жыхароў — Яўстах Рапацэвіч, тады 8-гадовы хлопчык, — бачыў тую трагедыю на свае вочы. Але шмат расказваць пра гэта не давялося.

Тым больш імя палеглага было невядомае. Так і дагледалі магілу безыменнага салдата старажылы, нават не здагадваючыся пра тое, што тыя, каму гэтае імя добра вядома, не могуць адшукаць святое для іх пахаванне...

## Ракавая куля

У гэтыя дні пляменніца загінуўшага на беларускай зямлі салдата не толькі пабывала на гэтым месцы, а і пераканалася, што абставіны гібелі продка — зусім не легенда.

Іван Кутушнікаў быў адзіным савецкім воінам, які загінуў пры вызваленні Крэва. Па словах сведкі тых падзей, калі вайсковае злучэнне, у складзе якога быў і чырвонаармеец, 7 ліпеня 1944 года ішло праз сяло, немцаў там ужо не было. Але так думалі вызваліцелі. І камандзір самаходнай устаноўкі вылез на браню, каб звeрыць па планшэце маршрут. У гэты момант яго напаткала куля адзінага немца-снайпера, які застаўся ў сяле...


Іван КУТУШНІКАЎ (у цэнтры) — курсант Саратаўскага танкавага вучылішча. 10 ліпеня 1943 года.

Як потым высветлілася, высачыць савецкага афіцэра салдату вермахта ўдалося са званіцы мясцовай царквы. Відаць, той хаваўся тут пасля адступлення сваіх войскаў.

Разгневаны смерцю таварыша, экіпаж развярнуў самаходку і накіраваў гармату на царкву (дарэчы, Крэўскай царкве святога Аляксандра Неўскага сёння больш як 150 гадоў). Але невядома адкуль выскачыў званар і пачаў маліць вайскоўцаў не чапаць храм. «Сярод іх, думаю, былі людзі веруючыя, якія памяталі, што такое царква, бо што яшчэ магло іх спыніць?», — разважае сваячка забітага воіна.

Пакуль ашаломленыя знянацку чырвонаармейцы спрабавалі зразумець, што адбылося, фашыст спусціўся са званіцы і пабег па дарозе. Салдаты хутка завялі матор і пачалі даганяць снайпера. Яго проста раздушылі...

## Апошні прытулак салдата

Смаргонь вызвалілі 4 ліпеня 1944 года. Ад Крэва да Смаргоні — адлегласць даўжынёй у кіламетраў 20. Каб ачысціць ад ворага гэты невялічкі кавалак зямлі, спатрэбіліся тры дні...

— У апошнім лісце дзядзькі Вані была такая фраза: «Мы падтрымліваем атакі», — расказвае пляменніца Івана Кутушнікава. — Можа, гэтыя радкі былі напісаны якраз у перыяд вызвалення Смаргонскага раёна? Сапраўды, сваім артабстрэлам яны падтрымлівалі атакі пяхоты. Ніхто не ведаў, што вораг нагадае пра сябе на вызваленай тэрыторыі...

Івана Кутушнікава пахавалі недалёка ад той самай царквы. Пахавалі пад елкай, якая здаўна лічыцца сімвалам Сібіры. Але гэтае месца не стала апошнім прытулкам салдата. Спачатку яго астанкі перапахавалі побач з мясцовым мемарыялам воінам-вызваліцелям, потым апошняй магілай малодшага лейтэнанта стала брацкае пахаванне ў цэнтры Смаргоні.

Да нядаўняга часу Іван Кутушнікаў значыўся там адным з 287-мі невядомых салдат. Неўзабаве лічба, выгравіраваная на мемарыяле, паменшыцца, а сярод прозвішчаў чырвонаармейцаў, упісаных у гісторыю раёна і на пастаменце, на аднаго стане больш.

## Архівы маўчаць

— Збіраючыся ў Мінск, я нават не ўяўляла, што знайду, дзе пахаваны дзядзька Ваня, — прызнаецца Таццяна Весніна. — Нават не разлічвала адшукаць і тое месца, дзе ён быў пахаваны першапачаткова. Мяне вельмі кранула і ўразіла, што вяскоўцы ўвесь час даглядалі магілу, нягледзячы на тое, што для іх ён быў проста невядомым салдатам...

Знайсці магілу сына да апошняга марыла яго маці. Увесь час, па ўспамінах унучкі, у хаце бабкі вісеў ваенны партрэт Івана, памяць аб ім перадавалася. Як любая маці, яна не магла змірыцца з тым, што няма дзе пакланіцца. Так і не дачакалася добрых навін. Затое дажыла да гэтай падзеі малодшая сястра Івана Кутушнікава.

— Мая мама нарадзілася ў 1941 годзе, — удакладняе пляменніца палеглага ў Беларусі салдата. — Са сваім братам яна ніколі не бачылася: у 1939 годзе дзядзька Ваня быў прызваны ў Чырвоную Армію. Ужо рыхтаваўся да дэмабілізацыі, а атрымалася ўсё наадварот.

Іван Кутушнікаў нарадзіўся ў звычайнай сялянскай сям'і, дзе выхоўваліся шасцёра дзяцей. Іван быў самым старэйшым. У родным сяле Троіцкае, што ў Алтайскім краі, скончыў 10 класаў. Пасля шасцімесячных курсаў метэаролагаў працаваў начальнікам метэастанцыі ў цяперашнім Горна-Алтайску (Рэспубліка Алтай). У пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў паскораным рэжыме скончыў Саратаўскае танкавае вучылішча і атрымаў пагоны малодшага лейтэнанта. У сям'і захоўваецца арыгінальны атэстат аб заканчэнні вучылішча. Гэта было 10 чэрвеня 1943 года. Якім быў лёс Івана Кутушнікава да яго гібелі, сямейнікі не ведаюць. Дзе ваяваў гэты год, ці быў узнагароджаны — для іх гэта тайна. Маўчаць і архівы...


Пляменніца Івана Кутушнікава Таццяна ВЕСНІНА расказвае сведку гібелі савецкага салдата Яўстаху РАПАЦЭВІЧУ, што елка, пад якой першапачаткова быў пахаваны воін-сібірак, заўжды была сімвалам Сібіры.

## Цікавая дэталь

Пакуль я рыхтавала гэтую публікацыю і ўчытвалася ў скупыя архіўныя радкі аб беззваротных стратах 29-га танкавага корпуса, у якім ваяваў герой публікацыі, мне трапіла думка. Знаёмыя населеныя пункты і даволі зразумелыя даты вярнулі мяне да нядаўняй камандзіроўкі. Напярэдадні 3 ліпеня з ветэранам Вялікай Айчыннай Аляксандрам Фенем мы прайшліся па мясцінах, дзе ішлі баі за вызваленне сталіцы. Аказалася, што і ён ваяваў у тым жа самым танкавым корпусе, што і Іван Кутушнікаў.

Тэлефаную Аляксандру Фёдаравічу. Ён пацвярджае, што пасля таго, як быў вызвалены Мінск, разам з войскамі яны вызвалялі Смаргонскі раён і — увага! — Крэва. На жаль, загінуўшага салдата ён не ведаў. Ды і як гэта магчыма, калі танкавы корпус налічваў некалькі танкавых брыгад і іншых вайсковых злучэнняў! Не памятае ён і пра тое, каб нехта расказваў, пры якіх абставінах загінуў гэты салдат. Але пагадзіўся расказаць яго пляменніцы пра баявы шлях 29-га танкавага корпуса, у якім ваяваў яе дзядзька Ваня.

***

Яны доўга гутарылі. Праз некалькі дзён пляменніца савецкага салдата, які загінуў пры вызваленні беларускага мястэчка, рушыла на Радзіму. Дамоў, у Томск, яна везла не толькі ўспаміны сведкі і аповед саслужыўца свайго дзядзькі, а і зямлю з тых мясцін, у якіх спачываў і спачывае яе продак, якога сям'я знайшла больш чым праз сем дзесяцігоддзяў. Але, паводле запавету маці салдата, усё ж знайшла...

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*



## Ликвидатор УП «Брестская мебельная фабрика» – ООО «Центр правовых услуг»

### проводит открытый аукцион по продаже имущества, находящегося по адресу: г. Брест, ул. Краснознаменная, 2:

**1. Аукцион по продаже имущества**

| № лота | Наименование имущества | Ед. изм. | Кол-во | Начальная стоимость предмета торгов без НДС, бел. руб. | Ставка НДС | Сумма НДС, бел. руб. | Цена предмета торгов с НДС, бел. руб. | Сумма шага аукциона в размере 5%, бел. руб. | Размер задатка за участие в аукционе 10%, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Станок вертикально-сверлильный СВА-3, 1990 г.в инв. №915 | шт. | 1 | 576,30 | 20% | 115,26 | 691,56 | 34,58 | 69,16 |
| 2 | Станок ребросклеивающий Kuper FW 1150, 1983 г., инв. №919 | шт. | 1 | 882,00 | 20% | 176,40 | 1058,40 | 52,92 | 105,84 |
| 3 | Станок горизонтально-сверлильный МА-174, 1983 г., инв. №920 | шт. | 1 | 1166,70 | 20% | 233,34 | 1400,04 | 70,00 | 140,00 |
| 4 | Станок фрезерно-копировальный Griggio G900, 1997 г., инв. №2026 | шт. | 1 | 1241,30 | 20% | 248,26 | 1489,56 | 74,48 | 148,96 |
| 5 | Станок горизонтально-сверлильный МА-17, 1997 г., инв. № 2033 | шт. | 1 | 1166,70 | 20% | 233,34 | 1400,04 | 70,00 | 140,00 |
| 6 | Станок горизонтально-сверлильный МА-17, 1997 г., инв. №2034 | шт. | 1 | 1166,70 | 20% | 233,34 | 1400,04 | 70,00 | 140,00 |
| 7 | Станок кромкошлифовальный ФКШ 1997 г., инв. №2037 | шт. | 1 | 392,00 | 20% | 78,40 | 470,40 | 23,52 | 47,04 |
| 8 | Станок сверлильно-присадочный ПС-251Е, 2000 г., инв. №2065 | шт. | 1 | 1399,90 | 20% | 279,98 | 1679,88 | 83,99 | 167,99 |
| 9 | Обрабатывающий центр Rover 22 Bisse, 2002 г., инв. №2087 | шт. | 1 | 10106,70 | 20% | 2021,34 | 12128,04 | 606,40 | 1212,80 |
| 10 | Станок универсально-заточной механизированный 3Д642, 1983 г., инв. №623 | шт. | 1 | 1953,40 | 20% | 390,68 | 2344,08 | 117,20 | 234,41 |
| 11 | Станок ножовочный 8Б72, 1982 г., инв. №799 | шт. | 1 | 600,00 | 20% | 120,00 | 720,00 | 36,00 | 72,00 |
| 12 | Станок точильно-шлифовальный 3Б633, 1985 г., №802 | шт. | 1 | 650,80 | 20% | 130,16 | 780,96 | 39,05 | 78,10 |
| 13 | Станок точильно-шлифовальный 3Б634, 1985 г., №808 | шт. | 1 | 650,80 | 20% | 130,16 | 780,96 | 39,05 | 78,10 |
| 14 | Станок точильно-шлифовальный 3Б635, 1982 г., №809 | шт. | 1 | 691,80 | 20% | 138,36 | 830,16 | 41,51 | 83,02 |
| 15 | Станок настольно-сверлильный 2М-112, 1987 г., №830 | шт. | 1 | 233,30 | 20% | 46,66 | 279,96 | 14,00 | 28,00 |
| 16 | Станок плоскошлифовальный 3 г.71М, 1979 г., инв. №867 | шт. | 1 | 2040,00 | 20% | 408,00 | 2448,00 | 122,40 | 244,80 |
| 17 | Станок заточной В3-384, 1983 г., инв. №2031 | шт. | 1 | 2349,50 | 20% | 469,90 | 2819,40 | 140,97 | 281,94 |
| 18 | Пресс гидравлический одностоечный П6324, 1983 г., инв. №620 | шт. | 1 | 400,00 | 20% | 80,00 | 480,00 | 24,00 | 48,00 |
| 19 | Станок универсально-заточной механизированный 3Д642, 1986 г., инв. №789 | шт. | 1 | 1953,40 | 20% | 390,68 | 2344,08 | 117,20 | 234,41 |
| 20 | Компрессор ABA LT, 2001 г., инв. №2093 | шт. | 1 | 557,40 | 20% | 111,48 | 668,88 | 33,44 | 66,89 |
| 21 | Станок-полуавтомат для заточки дисковых пил ТЧПТ-4, 1984 г., инв. №836 | шт. | 1 | 1176,00 | 20% | 235,20 | 1411,20 | 70,56 | 141,12 |
| 22 | Низковольтный распределительный щит ЩО-70, 1983 г., инв. №310 | шт. | 1 | 160,00 | 20% | 32,00 | 192,00 | 9,60 | 19,20 |
| 23 | Трансформатор силовой ТИ-400-67, 1983 г., инв. №309 | шт. | 1 | 905,80 | 20% | 181,16 | 1086,96 | 54,35 | 108,70 |
| 24 | Лаконаносящая установка, 1983 г., инв. №2006 | шт. | 1 | 7636,00 | 20% | 1527,20 | 9163,20 | 458,16 | 916,32 |
| 25 | Выпрямитель сварочный ВД-306УЗ, 1983 г., инв. №813 | шт. | 1 | 268,00 | 20% | 53,60 | 321,60 | 16,08 | 32,16 |
| 26 | Фильтр рукавный ФРБМ-1, 2001 г., инв. №2100 | шт. | 1 | 5992,50 | 20% | 1198,50 | 7191,00 | 359,55 | 719,10 |
| 27 | Линия мини AEC Samsung, 2002 г., инв. №2097 | шт. | 1 | 75,00 | 20% | 15,00 | 90,00 | 4,50 | 9,00 |
| 28 | Щит дистанционного контроля воды ТЭМ 104, 1989 г., инв. №861 | шт. | 1 | 200,00 | 20% | 40,00 | 240,00 | 12,00 | 24,00 |
| 29 | Установка водоподготовительная блочная БХ – 4540/П, 1983 г., инв. №312 | шт. | 1 | 466,00 | 20% | 93,20 | 559,20 | 27,96 | 55,92 |
| 30 | Конденсатный бак, 1983 г., инв. №758 | шт. | 1 | 467,00 | 20% | 93,40 | 560,40 | 28,02 | 56,04 |
| 31 | Конденсатный бак, 1983, инв. №759 | шт. | 1 | 467,00 | 20% | 93,40 | 560,40 | 28,02 | 56,04 |
| 32 | Теплогенератор Т г., 2006 г., инв. №935 | шт. | 1 | 2666,70 | 20% | 533,34 | 3200,04 | 160,00 | 320,00 |
| 33 | Трансформатор сварочный ПДМ-317 У2, 1989 г., инв. №883 | шт. | 1 | 45,00 | 20% | 9,00 | 54,00 | 2,70 | 5,40 |
| 34 | Молот ковочно-пневматический МА 4129, 1983 г., инв. №629 | шт. | 1 | 964,00 | 20% | 192,80 | 1156,80 | 57,84 | 115,68 |
| 35 | Низковольтный распределительный щит ЩО-70, 1983 г., инв. №307 | шт. | 1 | 160,00 | 20% | 32,00 | 192,00 | 9,60 | 19,20 |
| 36 | Вентиляционная установка П-2, 1983 г., инв. №704 | шт. | 1 | 162,00 | 20% | 32,40 | 194,40 | 9,72 | 19,44 |
| 37 | Станок шлифовально-ленточный ШЛПС-5П, 1983 г., инв. №447 | шт. | 1 | 900,00 | 20% | 180,00 | 1080,00 | 54,00 | 108,00 |
| 38 | Станок шлифовально-ленточный ШЛПС 5П, 1983 г.в., инв. № 451 | шт. | 1 | 900,00 | 20% | 180,00 | 1080,00 | 54,00 | 108,00 |
| 39 | Станок вертикально-сверлильный СВА-3, 1983 г., инв. № 921 | шт. | 1 | 605,00 | 20% | 121,00 | 726,00 | 36,30 | 72,60 |
| 40 | Водоподогреватель, 1983 г., инв. № 313 | шт. | 1 | 37,00 | 20% | 7,40 | 44,40 | 2,22 | 4,44 |
| 41 | Водоподогреватель,1983 г., инв. № 314 | шт. | 1 | 37,00 | 20% | 7,40 | 44,40 | 2,22 | 4,44 |
| 42 | Машина бумагорезочная одноножевая БР-72, 1983 г., инв. № 561 | шт. | 1 | 524,00 | 20% | 104,80 | 628,80 | 31,44 | 62,88 |
| 43 | Распределительное устройство 10 КВ КСО-272, 1983 г.в., инв. № 311 | шт. | 1 | 1843,00 | 20% | 368,60 | 2211,60 | 110,58 | 221,16 |
| 44 | Таль электрическая ТЭ-200, 1983 г.в., инв. № 772 | шт. | 1 | 566,00 | 20% | 113,20 | 679,20 | 33,96 | 67,92 |
| 45 | Электрический коммутационный щит, 1983 г.в., инв.№329 | шт. | 1 | 263,00 | 20% | 52,60 | 315,60 | 15,78 | 31,56 |
| 46 | Пульт пожарной сигнализации ППС-1, 1983 г.в. инв. №1011 | шт. | 1 | 16,00 | 20% | 3,20 | 19,20 | 0,96 | 1,92 |
| 47 | Пульт пожарной сигнализации ППС-1, 1983 г.в. инв. №1012 | шт. | 1 | 1,50 | 20% | 0,30 | 1,80 | 0,09 | 0,18 |
| 48 | Подстанция трансформаторная унифицированная комплектная ЕТП-У, 1983 г.в., инв. №301 | шт. | 1 | 1091,50 | 20% | 218,30 | 1309,80 | 65,49 | 130,98 |
| 49 | Установка конденсаторная низковольтная, 1983 г.в., инв. № 302 | шт. | 1 | 66,70 | 20% | 13,34 | 80,04 | 4,00 | 8,00 |
| 50 | Установка конденсаторная низковольтная, 1983 г.в., инв. № 303 | шт. | 1 | 66,70 | 20% | 13,34 | 80,04 | 4,00 | 8,00 |
| 51 | Установка конденсаторная низковольтная, 1983 г.в., инв. № 304 | шт. | 1 | 66,70 | 20% | 13,34 | 80,04 | 4,00 | 8,00 |
| 52 | Установка конденсаторная низковольтная, 1983 г.в., инв. № 305 | шт. | 1 | 66,70 | 20% | 13,34 | 80,04 | 4,00 | 8,00 |
| 53 | Установка конденсаторная низковольтная, 1983 г.в., инв. № 306 | шт. | 1 | 66,70 | 20% | 13,34 | 80,04 | 4,00 | 8,00 |
| 54 | Сигнализатор термохимический СТХ-3У4 5, 1983 г.в., инв. №1001 | шт. | 1 | 5,20 | 20% | 1,04 | 6,24 | 0,31 | 0,62 |
| 55 | Сигнализатор термохимический СТХ-3У4 6, 1983 г.в., инв. №1002 | шт. | 1 | 5,20 | 20% | 1,04 | 6,24 | 0,31 | 0,62 |
| 56 | Сигнализатор термохимический СТХ-3У4 10, 1983 г.в., инв. №1003 | шт. | 1 | 5,20 | 20% | 1,04 | 6,24 | 0,31 | 0,62 |
| 57 | Сигнализатор термохимический СТХ-3У4 4, 1983 г.в., инв. №1004 | шт. | 1 | 5,20 | 20% | 1,04 | 6,24 | 0,31 | 0,62 |
| 58 | Сигнализатор термохимический СТХ-3У4 3, 1983 г.в., инв. №1005 | шт. | 1 | 5,20 | 20% | 1,04 | 6,24 | 0,31 | 0,62 |
| 59 | Сигнализатор термохимический СТХ-3У4 7, 1983 г.в., инв. №1006 | шт. | 1 | 5,20 | 20% | 1,04 | 6,24 | 0,31 | 0,62 |
| 60 | Сигнализатор термохимический СТХ-3У4 8, 1983 г.в., инв. №1007 | шт. | 1 | 5,20 | 20% | 1,04 | 6,24 | 0,31 | 0,62 |
| 61 | Сигнализатор термохимический СТХ-3У4 2, 1983 г.в., инв. №1008 | шт. | 1 | 5,20 | 20% | 1,04 | 6,24 | 0,31 | 0,62 |
| 62 | Таль электрическая, 1983 г.в., инв. №630 | шт. | 1 | 565,30 | 20% | 113,06 | 678,36 | 33,92 | 67,84 |
| 63 | Парогенератор, 2002 г.в., инв. №2017 | шт. | 1 | 166,70 | 20% | 33,34 | 200,04 | 10,00 | 20,00 |
| 64 | Блок выпрямительный ВБ-60/5,3+D243, 1983 г.в., инв. № 1205 | шт. | 1 | 84,30 | 20% | 16,86 | 101,16 | 5,06 | 10,12 |
| 65 | Металлический гараж №1, пл.17,6 кв.м | шт. | 1 | 442,20 | 20% | 88,44 | 530,64 | 26,53 | 53,06 |
| 66 | Металлический гараж №2, пл. 17,6 кв.м | шт. | 1 | 442,20 | 20% | 88,44 | 530,64 | 26,53 | 53,06 |
| | ИТОГО: | | **66** | 60849,50 | | 12169,90 | 73019,40 | 3650,97 | 7301,94 |

**Аукцион состоится 16 августа 2016 года в 10 часов 00 минут по адресу: г. Брест, ул. Ясеневая, 20А офис 203**

|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 13.04.2016

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **21.07.2016 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **20.07.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

Далягляды

# МУДРАСЦЬ ТЫСЯЧАГОДДЗЯЎ

## ПРЭЗЕНТАВАНЫ ПЕРАКЛАД ПЕРШАГА КОЛА «РЫГВЕДЫ»

**Урачыстая імпрэза з удзелам высокіх гасцей прайшла ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.**

«Рыгведа» — адзін з самых старажытных тэкстаў чалавецтва, створаны на санскрыце каля чатырох тысяч гадоў таму. Адметна, што пазнаёміцца з ім і далучыцца да мудрасці многіх пакаленняў індыйскіх брахманаў сёння могуць і беларусы. Пераклад, выканаць Ігарам Куліковым, унікальны, ён перадае не толькі змест старажытнай кнігі, але і захоўвае яе паэтычную форму. Выданне кнігі праз краўдфандынгавую пляцоўку фінансава падтрымалі больш як паўсотні беларусаў, яе выхад стаў магчымым і дзякуючы падтрымцы Савета Індыі па культурных сувязях.



Першая кніга «Рыгведы» па-беларуску — падарунак Міхаілу МЯСНІКОВІЧУ ад перакладчыка Ігара КУЛІКОВА.

Таму ўвага да перакладу з боку кіраўніцтва краіны не выпадковая, гэта сапраўды значная падзея ў беларуска-індыйскім культурным жыцці. Так, **Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ** падчас прэзентацыі заўважыў:

— Я курырую беларуска-індыйскі кірунак супрацоўніцтва і хачу адзначыць, што ў нас склаліся і досыць рытмічна развіваюцца ўсе сферы супрацы: гандлёва-эканамічная, палітычная, навукова-тэхнічная, ваенна-тэхнічная, культурная. Нягледзячы на тое, што Індыя — гэта вялікая краіна з насельніцтвам амаль паўтара мільярда, а ў Беларусі ўсяго 10 мільёнаў, мы зусім не адчуваем дыстанцыі. Да нас ставяцца шчыра, з цеплынёй, уважліва і зацікаўлена.

Думку Міхаіла Уладзіміравіча прадоўжыў **міністр культуры Барыс СВЯТЛОЎ**:

— Нашы культурныя сувязі з Індыяй досыць трывалыя. Іх гісторыя налічвае не адно дзесяцігоддзе. І выхад першага кола «Рыгведы» ў перакладзе на беларускую мову — выдатны падарунак нашаму чытачу, культурнай грамадскасці. Адметна, што гэты пераклад, які прадстаўляе твор старажытнаіндыйскай літаратуры, у некаторай ступені паказвае беларускі погляд — менавіта праз прызму бачання перакладчыка.

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Індыі ў Беларусі Панкадж САКСЭНА** назваў выхад першага кола «Рыгведы» па-беларуску своеасаблівым мостам паміж індыйскай і беларускай культурамі, нашымі народамі. Спадар пасол таксама падкрэсліў:

— Пераклад першага кола старажытнаіндыйскай «Рыгведы», зроблены Ігарам Куліковым, заслугоўвае самай высокай ацэнкі. Праз сваю працу ён паказвае сябрам-беларусам спадчыну індыйскага народа. Работа Ігара ўнікальная, ён прыклаў вялікія намаганні, каб выканаць менавіта паэтычны пераклад гімнаў з санскрыту на беларускую мову.

Таксама спадар Панкадж Саксэна паведаміў, што ў кастрычніку ў Індыі пройдуць Дні беларускай культуры, і кіраўніцтва краіны акажа значную падтрымку ў правядзенні гэтага мерапрыемства.

Пра тое, чым вылучаецца старажытнаіндыйская «Рыгведа» і чаму гэты тэкст сапраўды ўнікальны, расказаў **перакладчык Ігар КУЛІКОЎ**:

— Хоць вы бачыце цяпер «Рыгведу» ў выглядзе кнігі, насамрэч гэта не зусім кніга ў строгім сэнсе гэтага слова. Яна заўсёды існавала як вусны тэкст. Яго ўнікальнасць у тым, што ўсе тысячагоддзі аж да нашых дзён «Рыгведа» перадаецца вусным спосабам ад настаўнікаў да вучняў. Калі сёння паехаць у Індыю, можна знайсці брахмана, які па памяці прачытае ўрывак з «Рыгведы», як гэта рабілі тры тысячы гадоў таму. Першы запісаны тэкст, які мы маем цяпер як артэфакт, датуецца прыкладна XII стагоддзем і калі параўнаць яго з тым, што чытаюць па памяці брахманы, то не знойдзецца ніякіх адрозненняў. Гэта ўнікальны вынік творчасці чалавечага розуму, які нідзе ў свеце не мае аналагаў.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА

Падчас прэзентацыі слова мае міністр культуры Барыс СВЯТЛОЎ.

Першае кола «Рыгведы», якое ўжо выйшла па-беларуску, самае вялікае ў гэтым творы, яно ўключае 191 гімн-хваласпеў. Гімны гэтыя самыя разнастайныя, прысвечаныя розным багам і з'явам прыроды. І хоць гэта чытво не сюжэтнае, яно захапляе. Тут згадваюцца цікавыя міфы, паралелі якім можна знаходзіць нават у беларускіх народных песнях.

— Цэнтральны міф «Рыгведы» звязаны з богам Індрам і яго барацьбой са змеем, — расказвае Ігар Кулікоў, — Бог Індра маланкай забівае змея, які аблытаў гару і схаваў там сонца, зоры і воды. Пасля смерці змея пачынаецца дзень, выплываюць воды і вынасяць сонца на неба. Калі ж звярнуцца да беларускіх валачобных песень, то можна заўважыць у іх сюжэт пра святога Юр'я, які забівае цмока і «адмыкае» расу.

Пераклад «Рыгведы» на беларускую мову працягваецца. Цяпер Ігар працуе над перастварэннем яе дзясятага кола, што змяшчае гімны, прысвечаныя пахавальным, вясельным абрадам, філасофскія хваласпевы пра мову, веды.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
vesialuha@zviazda.by

Прэм'ера

# Птушка, што ляцела на пажар

## Пра тое, чаму нелюбоў нараджае нянавісць

**Гэта не жанчына, а нейкая фурыя. Пачвара ў аблічы вытанчанай дамы. А сама сябе бачыць рэдкай птушкай, прыкладам самаахвярнасці. Вось толькі як дзеці гэтага не адчуваюць. Адплачваюць эгаістычнай маці. Жудасна...**

У шведскага пісьменніка і драматурга Аўгуста Стрындберга былі складаныя стасункі з жанчынамі, што адбілася на творчасці: вобразы кабет, з якіх не варта браць прыклад, у яго нярэдкія. Часам здаецца, што ён помсціць жанчынам са свайго жыцця, але пераносіць свае адносіны ці не на ўвесь жаночы род. Вось і п'еса «Пелікан» якраз у ліку твораў з цэнтральным вобразам жанчыны. Жанчыны-маці. Апошняе — істотна, таму што мяняе ўспрыманне твора. Асабіста-аўтарскае стаўленне абрастае кантэкстам, які прымушае разважаць пра чалавека, што вырастае ў асяроддзі, дзе пра мараль ніхто не памятае.

Стрындберг пра гэта разважаў у пачатку XX стагоддзя (адчуваючы кардынальныя змены ў грамадстве). Але актуальнасць яго разваг захоўваецца, на жаль, у наш час. Таму пастаноўку твора шведскага аўтара ўзяўся паставіць на сцэне Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Аляксандр Гарцуеў. Ён любіць псіхалагічныя творы, з іх пачынаў як рэжысёр. І вось зноў сваё, любімае: пра людзей і тое, што перашкаджае жыць — заганы, хлусня, жарсць. Такое суквецце зла.

Яго носьбіт — галоўная гераіня Эліза, ролю якой выконвае Людміла Сідаркевіч. Жанчына вытанчаная, прывабная. Хоча гэтым актыўна карыстацца: у яе ёсць малады палюбоўнік (акцёр Максім Брагінец), спакуснік з халодным разлікам (сярод усяго шэрага кідаюцца ў вочы чырвоныя дэталі яго вопраткі, гэта спрацоўвае як правакацыя ўвагі да яго з боку гераіні). Каб ён быў бліжэй, нават жыў увесь час у адной хаце, яна выдае за яго сваю ж дачку. На вяселлі зяць, каб парадаваць дарагую цешчу, прачытаў пранікнёны верш пра цудоўную птушку пелікана, якая ахвяруе сабой дзеля сваіх птушанят: калі няма чым іх карміць, то сілкуе ўласнай крывёй. Эліза расчуленая: гэта пра яе. Няўжо яна насамрэч так думае? Ці гуляе ў прыгожую сябе? Нездарма ж цягам усяго спектакля ў цэнтры сцэны ўзвышаецца абрыс птушкі з вялікімі крыламі. Гэтым абрысам (вобразам у вачах іншых) кіруе сама Эліза: то крылы, нібы ветразі, узносяць высока яе мары пра каханне і шчасце. То ападаюць: не можа лётаць той, хто скаваны цяжкімі кайданкамі зямных жарсцяў. Цялесная юрлівасць кіруе ёй, інстынкт, за якім яна не бачыць нічога іншага. Нават уласных дзяцей.



Сын і дачка разумеюць, што маці ўвесь час іх падманвае. Што здраджвала нябожчыку-бацьку. Што фактычна абкрадвала сям'ю дзеля палюбоўніка. Эканамічныя справы сям'і ідуць кепска, і калі што-небудзь засталося ад бацькі, то сітуацыю гэта не ратуе. Будучыні няма. Так адчуваюць дзеці. Увесь спектакль яны ходзяць і размаўляюць як пакінутыя, беспрытульныя, маленькія істоты, пры тым, што ўжо дарослыя. Артысты Арцём Курэнь і Ганна Семяняка дасягаюць гэтага ўражання, каб падкрэсліць: бацькоўскі крайні эгаізм шкодзіць нават дарослым дзецям, яны губляюць самастойнасць з-за таго, што так ці інакш чакаюць увагі маці (прывязка да яе існуе). А яна працягвае клапаціцца пра свае інтарэсы, не бачыць іх. Яны паводзяць сябе як маленькія і зусім бездапаможныя (наўмысна?). Але нават у складанай сітуацыі пасля смерці бацькі клопат Элізы пра дзяцей несапраўдны. Фальшывыя адносіны не дазваляюць бачыць перспектывы ў жыцці наогул. Дзеці робяць свой выбар. Летуценны пелікан (ці матылёк) павінен загінуць. І ўсё, што ад яго засталося.

Амаль фрэйдызм (пад уплывам якога знаходзіўся аўтар гэтай п'есы Аўгуст Стрындберг). Таму ўзроставае абмежаванне ў тэатры пазначана як «18+». Справа не столькі ў сцэнах з намёкамі на секс (усё вельмі ўмоўна і даволі пластычна абазначана). Справа ў псіхалогіі героя, пра якую трэба думаць па-даросламу, у той глыбіні чалавечых таямніц, якія хаваюцца за будзённасцю, але могуць нечакана (у залежнасці ад сітуацыі) выбухнуць сапраўды вялікай бядой. Гэта ў Стрындберга п'еса «Пелікан» кампактная — сітуацыя асобна ўзятай сям'і, з малой колькасцю дзеючых асоб. Але ці не адсюль пачынаюцца вялікія драмы: ад дзіцячых псіхалагічных траўм узрастае чалавечая жорсткасць, якая можа прыводзіць да больш шырокіх і глабальных наступстваў ужо ў грамадстве. Нічога не ўзнікае на пустым месцы, і калі нешта недзе не так, то прычыны трэба шукаць вельмі глыбока, і сапраўды, у дзяцінстве.

Абстрагавацца ад асобна ўзятай шведскай сям'і пачатку XX стагоддзя ў гэтым спектаклі дазваляе стылістыка. Па-першае, плаўнасць і пластычнасць рухаў саміх артыстаў (над гэтым працаваў рэжысёр Яўген Карняг), гэтаму спрыяе псіхадэлічная музыка Дзмітрыя Фрыгі. Таксама мастак па касцюмах Валянціна Няборская зрабіла вобразы не гістарычныя і не казачныя (хутчэй прытчавыя), і не зусім карыкатурныя (на мяжы), але да іх не ўзнікае цяпла і шкадавання — ні да кога. Хіба што да нябожчыка-таты, прывід якога мроіцца Элізе. Стрындберг і ў гэтым быў сабой (мужчына ў яго — наіўная ахвяра), але каб была зразумелая мараль, што для драматурга істотна, то патрэбны нейкі персанаж для кантрасту, няхай ён і не з'яўляецца на сцэне.

Мараль патрэбна і нам. Не толькі з твора драматычнага, але наогул, па жыцці. Таму замежную п'есу адмыслова для тэатра пераклалі на беларускую мову Ірына Гушчына і Андрэй Хадановіч. Пастаноўка ажыццявілася пры падтрымцы Пасольства Швецыі ў Рэспубліцы Беларусь. Пасол асабіста вітаў і высока ацаніў прэм'еру. З тымі ж думкамі, відаць, будуць сыходзіць пасля спектакля прыхільнікі творчасці Гарцуева — тут ён у сваёй стыхіі. Стылістыка, вобразы і сутнасць самой драмы могуць заінтрыгаваць не толькі тых, хто сочыць за тэатральнымі з'явамі ў Беларусі: гэта ж пра маці, якая не жыве дзеля дзяцей. Гэта неяк не па-нашаму? А калі так: маці, якая займаецца сабой і абыякавая да таго, што адчуваюць дзеці. Ужо бліжэй?.. Пра маці сямейства, якая дзеля таго, каб ёй было зручна жыць, гатовая заплюшчваць вочы на тое, як і чаго хочуць блізкія, што ім на карысць, а што — не. Тым самым падштурхоўвае іх да граху: лепш памерці, чым ёй сказаць, патлумачыць, ад чаго так балюча. Яна не зразумее. Не зменіцца. Няшчасная...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

Вернісаж

# Бакст. Каб памяталі

## Выстаўка «Час і творчасць Льва Бакста» адкрылася ў Рызе

**Мастацкі музей «Рыжская біржа», што месціцца на Домскай плошчы латвійскай сталіцы, стаў фінальным прыпынкам міжнароднага турнэ праекта, прысвечанага 150-годдзю нашага знакамітага земляка.**

Выдатны мастак, сцэнограф, касцюмер, кніжны дызайнер і ілюстратар, ураджэнец Беларусі Леў Бакст, што сёння з'яўляецца яркай зоркай усёй еўрапейскай культуры, пакінуў пасля сябе багатую спадчыну. Таму і не дзіўна, што выстаўка да яго 150-годдзя, якая паказвае як работы самога Бакста, так і яго паплечнікаў, з поспехам прайшла ў Мінску і Вільнюсе, а цяпер пакарае Рыгу.

Чакаецца, што рыжане акажуць праекту не менш цёплы прыём, бо менавіта Латвійскі Нацыянальны мастацкі музей прадаставіў для экспазіцый у Мінску і Вільнюсе ўнікальную калекцыю рускага мастацтва Сярэбранага веку са сваіх багатых збораў.

Экспазіцыя «Час і творчасць Льва Бакста», арганізаваная пры падтрымцы Белгазпрамбанка, працягнецца ў «Рыжскай біржы» да 28 жніўня.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
vesialuha@zviazda.by

■ На адкрытай прасторы

# КЛАСІКА Ў ПАПУЛЯРНЫХ ФОРМАХ

## Як спалучаецца элітнае і масавае мастацтва

**Летнія мінскія суботы ўжо звыкла асацыююцца з музычнымі вечарамі ў гістарычнай частцы горада — джаз, класічная музыка, духавыя аркестры эстэтызуюць нашу штодзённасць. 25 чэрвеня прайшоў апошні з трох джазавых канцэртаў пад адкрытым небам у цэнтры сталіцы, якія наведала каля трыццаці тысяч чалавек. Цяпер гэтае месца збіраецца заняць выключны гукавы код — ужо 9 ліпеня адбудзецца першы канцэрт з серыі «Класіка ля ратушы». Музыка ад беларускіх і замежных выканаўцаў будзе гучаць кожную суботу да 27 жніўня.**

У нашай традыцыі, асабліва што тычыцца побыту нядаўняй мінуўшчыны, стасункі з сюітамі і накцюрнамі маюць асаблівую гісторыю. У савецкія часы прысутнасць класічнай музыкі ў жыцці народа, кажучы спецыяльнай лексікай, была надзвычай высокай. Невыпадкова галоўная гераіня стужкі «Вясна на Зарэчнай вуліцы» дзеля фартэпіяннага канцэрта Сяргея Рахманінава ігнаруе не каго-небудзь, а самога Мікалая Рыбнікава (дакладней яго персанажа Сашу Саўчанку).

**Савецкая асвета зрабіла стаўку на класічную — элітную — музыку, таму паўсюдна былі адкрыты музычныя школы, філармоніі і оперныя тэатры, якія арганізоўвалі выязныя канцэрты.**

Тагачасная асвета зрабіла стаўку на класічную — элітную — музыку, таму паўсюдна былі адкрыты музычныя школы, філармоніі і оперныя тэатры, якія арганізоўвалі выязныя канцэрты. Спраўна прадаваліся адпаведныя пласцінкі, на радыё і тэлебачанні трансляваліся выступленні аркестраў. Альтэрнатывай тэлеперадачы навін «Время» былі менавіта канцэрты класічнай музыкі, і не ў апошнюю чаргу таму, што галоўная праграма краіны не магла быць заменена больш відовішчным варыянтам. І сёння шмат хто памятае, як падчас жнівеньскага путчу 1991 года паміж выпускамі навін па тэлебачанні круцілі «Лебядзінае возера».

У савецкія часы класічная музыка перайшла мяжу паміж элітнай і масавай культурай. Праўда, апошняе паняцце ў гэтым



Фота БЕЛТА.

кантэксце павінна ўспрымацца не зусім традыцыйна. Масавая культура і культура для мас (слова «маса» ў камуністычнай дактрыне гучала шматзначна) — не адно і тое ж.

Зусім па-іншаму, але класічная музыка і сёння перасягае рубеж і ўліваецца ў «маскульт», становіцца яго часткай. Нақолькі рухомай з'яўляецца сама папулярная культура, настолькі арганічна ў ёй выглядаюць вялікія дасягненні Штраусаў. Фармат «Класікі ля ратушы» — канцэртаў на адкрытай гарадской прасторы — адзін з найлепшых і карысных прыкладаў гэтага ўзаемнага ўлівання. Музыка тут займае свае заслужаныя пазіцыі: класічныя творы гучаць не ў якасці фону, што характэрна для сённяшняга наваколля, а нарэшце як першы план — як твор мастацтва.

Сёлета на плошчы Свабоды пройдзе восем канцэртаў, а гэта ўдвая больш, чым летась, калі праект быў увасоблены ўпершыню. 9 ліпеня серыю канцэртаў адкрыюць два калектывы — Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр пад кіраўніцтвам Аляксандра Анісімава з выкананнем твораў Пятра Чайкоўскага, Іагана Штрауса, Яна Сібеліуса, Антаніна Дваржака, і ансамбль салістаў «Парціта» з музыкай Моцарта і Сальеры, Георга Гендэля, Ёзэфа Гайдна, Антоніа Вівальдзі.

Кожная субота ў праграме тэматычна маркіраваная. 16 ліпеня адбудзецца так званая «Музычная дуэль Паваroці і Сінатры»; каб вызначыць пераможцу, будзе замервацца гучнасць апладысментаў (асабіста я балельшчык за барытон Фрэнка Сінатры). Адна з субот будзе прысвечана музыцы барока — Іагана Баха, зноў жа Георга Гендэля і Антоніа Вівальдзі. У праграме праекта «Класіка ля ратушы» прагучыць таксама аўтэнтычная і класічная іспанская музыка (у гэты ж дзень можна будзе паглядзець на фламенка), музыка з савецкага і галівудскага кіно, класічныя творы ў джазавай апрацоўцы, нарэшце наша ўласная беларуская музыка XIX—XX стагоддзяў.

**Музыка тут займае свае заслужаныя пазіцыі: класічныя творы гучаць не ў якасці фону, што характэрна для сённяшняга наваколля, а нарэшце як першы план — як твор мастацтва.**

«Класіка ля ратушы» — знакавае для нашай прасторы спалучэнне высокай і папулярнай культуры. Паралельна з пляцоўкай, на якой прафесійныя музыканты будуць выконваць класічныя творы, што нагадвае нам філармонію, будуць працаваць складнікі праекта, уласцівыя мерапрыемствам іншага кшталту. Вялікія экраны, на якіх можна бачыць сцэну, — атрыбут канцэртаў папулярных сучасных выканаўцаў. Спецыяльная дзіцячая пляцоўка з аніматарамі, велапаркоўка, невялічкія экскурсіі, розыгрышы дзеля дабрачыннасці — усё гэта, далёкае ад камерных зал, пазычана з практыкі гарадскіх фестываляў. Ды і сама праграма створана ў тым ліку з імкненнем зацікавіць гараджан (чаго вартая толькі дуэль паміж Павароці і Сінатрам).

Такі сінтэз нарадзае свята для ўсіх, прычым безумоўнай яго вартасцю з'яўляецца неабмежаванасць месцаў. Нарэшце, праект «Класіка ля ратушы» мае функцыю асветы, той самай эстэтызацыі штодзённасці, насычэння прасторы прыгожым, што лічылася важным у тыя ж савецкія часы.

Хто б там ні быў, як ва ўжо згаданай карціне, яго можна праігнараваць дзеля канцэрта класічнай музыкі ў цэнтры горада. На ўсе мерапрыемствы ўваход вольны. Вечары арганізоўваць міжнародным фондам «Ідэя» і Мінскім гарвыканкамам пры падтрымцы генеральнага партнёра праекта — кампаніі Velcom.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*

■ На закрытай прасторы

# БАЛЕТ ЧАЙКОЎСКАГА МОЖА БЫЦЬ СМЕШНЫМ

## Тэатральны фестываль пакажа спектаклі з вядучых пляцовак свету

**«Лебядзінае возера» Пятра Чайкоўскага — самая частая і папулярная пастаноўка ў тэатрах па ўсім свеце. Балет можна знайсці ў Мінску, Санкт-Пецярбургу, Лондане, Пекіне, Парыжы, на галоўных і невялікіх пляцоўках, на марках, ва ўстойлівых выразах, у якасці ілюстрацыі патоку спадарожных тавараў, як сімвал жнівеньскага путчу 1991 года, дасканаласці, ідэальнага твора мастацтва, у спасылках, адсылках, інтэртэксце. Балет «Лебядзінае возера», першая пастаноўка якога, дарэчы, не атрымала папулярнасці, ставілася на тэатральных сцэнах як у традыцыйным, так і шматлікіх варыянтах мадэрнісцкага прачытання. Адной з самых вядомых з'яўляецца работа Мэцью Борна ў лонданскім тэатры Sadler's Wells, дзе партыі лебедзяў выконваюць танцоўшчыкі-мужчыны. Нашумелы балет пакажуць на вялікім экране ў Мінску на Летнім тэатральным фестывалі TheatreHD, які пачнецца ў кінатэатры «Цэнтральны» 13 ліпеня.**



Балеруны ў пастаноўцы «Лебядзінае возера» Мэцью Борна.

Гэта ўжо вядомая нам практыка: глядзець на вялікім кінаэкране найлепшыя спектаклі (якія не могуць наведаць беларускія пляцоўкі) з найбуйнейшых тэатральных сцэн. Гэта практыка вядомая і іншым краінам: сучасныя тэхналогіі дазваляюць дзеля таго, каб паглядзець пастаноўку Metropolitan Opera, абмежавацца квітком на бліжэйшую трансляцыю, а не набываць авіябілет да Нью-Ёрка. Гэтым разам Цэнтр візуальных і выканальніцкіх мастацтваў «Арт карпарэйшн» падрыхтаваў цэлую праграму спектакляў на вялікім экране, якія можна паглядзець у чаканні прамых уключэнняў, што пачнуцца толькі ў кастрычніку.

**Для акцёра сыграць караля Рычарда III — такі ж гонар, як сыграць Гамлета. У розныя часы гэты гонар мелі Лоўрэнс Аліўе, Алек Гінэс, Кевін Спейсі, Аль Пачына, Бенедзікт Камбербэтч і іншыя.**

За «Лебядзінае возера» Мэцью Борн атрымаў тэатральную прэмію «Тоні» (гэта ўзнагарода мае для тэатра такое ж значэнне, як Оскар для кінематографа), гэта яго самая знакамітая пастаноўка, дзе ён выступае ў якасці рэжысёра і харэографа. У класічным балеце з'явіўся англійскі гумар, некаторая парадыйнасць, проціластаўлены кананічнаму новы стыль у танцы і нарэшце зменены сюжэт, насычаны новымі сэнсамі. Толькі што імёны засталіся ранейшымі.

Мэцью Борн перайначыў не толькі «Лебядзінае возера» (яго варыянт нават увайшоў у школьную праграму Вялікабрытаніі), летні сезон TheatreHD пакажа і іншыя пастаноўкі аўтара, адметныя асаблівай харэаграфіяй і наватарствам, — «Кар Мэн», заснаваны на знакамітай оперы Жоржа Бізэ, якая перанесена ў амерыканскую аўтамайстэрню 1960-х гадоў; гатычная «Спячая прыгажуня» зноў на музыку Пятра Чайкоўскага, тут дзеянне пачынаецца ў 1890 годзе, у часы фей і вампіраў.

Цікавым пунктам праграмы фестывалю TheatreHD з'яўляецца пастаноўка п'есы Уільяма Шэкспіра «Рычард III» мастацкага кіраўніка лонданскага тэатра Алмейда Руперта Гулда, аб якой найбуйнейшыя выданні кшталту The Independent адазваліся са станоўчай крытыкай. Для акцёра сыграць караля Рычарда III — такі ж гонар, як сыграць Гамлета. У розныя часы гэты гонар мелі Лоўрэнс Аліўе, Алек Гінэс, Кевін Спейсі, Аль Пачына, Бенедзікт Камбербэтч і іншыя. Гэтым разам галоўную ролю выканаў Рэйф Файнс, вядомы шырокаму гледачу па стужках «Спіс Шындлера» Стывена Спілберга, «Англійскі пацыент» Энтані Мінгела, «Гатэль «Гранд Будапешт» Уэса Андэрсана і іншых.

У праграме сезона ёсць таксама італьянская опера «Любоўны напой» з Metropolitan Opera (галоўную партыю спявае Ганна Нятрэбка), «Адзін слуга, два гаспадары» з лонданскага Каралеўскага Нацыянальнага тэатра (з удзелам брытанскага коміка Джэймса Кордэна), увасобленая п'еса Уільяма Шэкспіра «Венецыянскі купец» з лонданскага тэатра «Глобус».

У фестывалі TheatreHD ёсць яшчэ адна частка, якая нівелюе адлегласць паміж аматарамі сапраўднага мастацтва і найважнейшымі, але далёкімі яго прыкладамі. На вялікім экране будуць паказваць дакументальныя фільмы, якія дазволяць наведаць найбуйнейшыя музеі, у падрабязнасцях разгледзець класічныя творы мастацтва ў суправаджэнні прафесійных мастацтвазнаўцаў. «Імпрэсіяністы» раскажуць пра Эдгара Дэга, Клода Манэ, Агюста Рэнуара, «Дзяўчына з жамчужнай завушніцай» сканцэнтруецца на знакамітай карціне Яна Вермеера, найважнейшыя творы мастака будуць разглядацца ў фільме «Рэмбрант».

**Сучасныя тэхналогіі дазваляюць дзеля таго, каб паглядзець пастаноўку Metropolitan Opera, абмежавацца квітком на бліжэйшую трансляцыю, а не набываць авіябілет да Нью-Ёрка.**

Апошні спектакль праграмы пройдзе 20 верасня. Расклад фестывалю можна знайсці ў афішы кінатэатра «Цэнтральны», які з'яўляецца нязменнай пляцоўкай для трансляцый спектакляў і адаптаваных да вялікага экрана тэатральных пастановак.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*

# ГОРАД, ДЗЕ ЖЫВУЦЬ

**Тут наогул не карыстаюцца мабільнымі тэлефонамі, амаль не ведаюць, што такое інтэрнэт, вядуць здаровы лад жыцця і ставяць рэкорды ў спорце. Гэтае месца можна было б лічыць узорным, калі б не падзеленая ўздоўж і папярок металічнымі кратамі тэрыторыя з замкамі на каваных дзвярах. Бо гэты горад створаны для людзей, якія не пажадалі жыць у згодзе з законам. І менавіта тут яны маюць усе шанцы пачаць свае жыццё зноў — з чыстай старонкі.**

## НАША СЛУЖБА І НЕБЯСПЕЧНАЯ, І ЦЯЖКАЯ

Летась самай буйной у Беларусі бабруйскай папраўчай калоніі №2 споўнілася паўстагоддзя. Яе начальнік Юрый Трутко дэманструе кнігу, прысвечаную гісторыі ўстановы. У альбоме шмат фота былых і цяперашніх супрацоўнікаў. І калі асуджаныя — толькі часовыя насельнікі гэтага своеасаблівага горада, то тыя, хто тут працуе, праводзяць у сценах калоніі палову свайго жыцця. Прычым па асабістым жаданні.

**«За такі вялікі перыяд цвярозасці ўпершыню ўбачыў, як шмат існуе вакол карысных рэчаў. Спорт, напрыклад».**

— Нічога звышнатуральнага ў гэтым няма, — кажа Юрый Трутко. — Мы жывём звычайным жыццём, крыху больш патрабавальныя да парадку, чым цывільныя. Ёсць супрацоўнікі, якія спачатку служылі, а потым прыйшлі сюды вольнанаёмнымі. Працуюць цэлыя дынастыі — генеральны дырэктар нашага прадпрыемства Сяргей Казлоў і яго сын Дзяніс, начальнік атрада Дзмітрый Бабкоў, які прыйшоў сюды ўслед за бацькам, мой намеснік Сяргей Гарадной, у якога сын таксама закончыў акадэмію МУС. Шмат хто з дзяцей супрацоўнікаў паступае ў акадэмію. Гэта прэстыжна, плюс афіцэрскае званне і заробак добры.

У гісторыі калоніі было шмат розных падзей. Нават уцёкі аднаго з асуджаных. Тэарэтычна гэта зрабіць немагчыма, але так склаліся зоркі. Праўда, уцякач не доўга пабыў на волі. На працягу сутак яго вярнулі, але пакаранне адправілі адбываць у калонію ўжо з больш жорсткім рэжымам. У ПК №2 застаюцца толькі тыя, хто спатыкнуўся ў жыцці ўпершыню. Ашуканцы, зладзеі, рабаўнікі, хабарнікі — тут можна пабачыць рэальнае ўвасабленне ўсіх чалавечых заган. Але больш за ўсё забойцаў і наркаманаў. Супрацоўнікі прытрымліваюцца мер бяспекі, але ніколі невядома, што ў асуджаных наўме. Таму ў мэтах бяспекі абслугоўвага персаналу калонія разбіта на лакальныя ўчасткі, якія закрываюцца. А дзеля папярэджання ўсякіх непаразуменняў тут працуе цэлы штат псіхолагаў.

## ЖЫЦЦЁ ПА ХВІЛІНАХ

У 6.00 пад'ём, паверка, сняданак, праца, абед, праца, вольны час, зноў паверка, адбой. Прыкладна па такім раскладзе жыве калонія. Парушаць яго сабе даражэй. Можна трапіць у штрафны карцар, пазбавіцца доўгачаканага спаткання, або, самае галоўнае, шанцу трапіць на волю датэрмінова.

Дзеля лепшага лёсу трэба навучыцца не толькі жыць па раскладзе, але і адмовіцца ад шкодных звычак. Адзінае, што можа сабе дазволіць асуджаны, гэта пакурыць. І тое ў строга адведзеным месцы. Пад забаронай таксама гульня ў карты. Нарды, шашкі, даміно — іншая справа. На гэтыя гульні няма ніякіх абмежаванняў. Пад строгай забаронай мабільныя тэлефоны. Замест гэтага тут ёсць перагаворны тэлефонны пункт. Можна патэлефанаваць сваякам і знаёмым, але пад кантролем адміністрацыі. Таксафон, дарэчы, не бясплатны. Пластыкавыя карткі прадаюцца ў краме на тэрыторыі калоніі. Там жа можна купіць гарбату, каву,



Тут усім не хапае зносін з блізкімі.

каўбасы, садавіны, прысмакі, цыгарэты. Было б за што.

Асуджаныя жывуць на ўсім казённым, але, як той казаў, без грошай у любым месцы адчуваеш сябе адзінока. Умовы іх зарабіць ёсць. Да занятасці зняволеных тут маецца шматпрофільнае прадпрыемства. Ёсць участкі дрэва- і металаапрацоўкі, швейны цэх, нават участак вытворчасці прадуктаў харчавання. Прадпрыемства нават зарабляе валюту на гумавай сумесі, якую ахвотна бяруць у Расіі. А гумавыя палкі, якімі ўзброены беларускія праваахоўнікі, выключна вытворчасці бабруйскай ПК №2.

Праца на розны густ, але грашовых вакансій кот наплакаў. Максімум, што можна зарабіць на прадпрыемстве — каля 3,5 мільёна. Але такія заробкі толькі ў зваршчыкаў, і тое, калі ёсць заказы. У астатніх заробкі вымяраюцца некалькімі нават не сотнямі, а дзясяткамі тысяч. Атрымаць рабочую прафесію, у тым ліку зваршчыка, можна ў мясцовым ПТВ. Так што тут усё ў руках самога асуджанага, кажа генеральны дырэктар прадпрыемства Сяргей Казлоў. Дарэчы, сам ён пачынаў тут сваю кар'еру 30 гадоў таму ў якасці майстра. Цяпер пад яго кіраўніцтвам працуе не толькі вытворчасць бабруйскай калоніі, але і ў Магілёве пры ЛПП.

## АД СУМЫ ДЫ АД ТУРМЫ...

Бабруйская калонія вядомая яшчэ і тым, што займаецца перавыхаваннем не толькі радавых грамадзян. У інтэрнэце можна знайсці інфармацыю, што ў розны час тут сядзелі вядомыя шырокаму колу людзі — праваабаронца Алесь Бяляцкі, былы кандыдат у прэзідэнты Андрэй Саннікаў, дырэктар «Магілёўдрэва» Андрэй Усаў, які сёлета пасля датэрміновага вызвалення атрымаў назначэнне на пасаду выканаўчага дырэктара па вытворчасці магілёўскага прадпрыемства «Строммашына». Але пра тых, каму прыходзіцца адбываць пакаранне ў ПК №2, Юрый Трутко не лічыць патрэбным гаварыць. «Тут усе роўныя», — каротка тлумачыць ён.

Яно так і ёсць. Цывільная касцюмы або дэмакратычныя джынсы тутэйшым насельнікам замяняюць чорныя робы. Першыя хвіліны, калі ў суправаджэнні супрацоўніка трапляеш на тэрыторыю, зняволеныя нават здаюцца ўсе на адзін твар. Кароткая стрыжка, аднолькавае адзенне, нават думкі, здаецца, адзін у адзін. Кожны запэўнівае, што асэнсаваў свае паводзіны і збіраецца выправіцца. Хочацца верыць, што не хлусяць. Бо для большасці з тых, хто тут знаходзіцца, яшчэ ўсё жыццё наперадзе. Звыш 40% асуджаных — маладыя людзі ва ўзросце ад 20 да 30 гадоў, амаль трэціна — ад 30 да 40. Ёсць, вядома, і тыя, каму менш за 20, або пенсіянеры, але гэта адзінкі. Тэрміны пакарання таксама розныя. У адных абмяжоўваецца 3 гадамі, амаль трэціна адбывае тэрмін ад 5 да 10 гадоў, кожны пяты — ад 10 да 15, ёсць нават з тэрмінам 25 гадоў — за асабліва цяжкае злачынства. Большасць асуджаных з Мінска і Мінскай вобласці, на другім месцы Гомельская, потым Віцебская і ўсе астатнія.

## ВЯСЕЛЛЕ ЗА КРАТАМІ

Трапіць за межы папраўчай калоны да канца тэрміну для асуджанага амаль немагчыма, адзіная сувязь са светам — гэта блізкія і знаёмыя. Дзеля таго, каб пачуць іх, а яшчэ лепей пабачыць, большасць тутэйшых жыхароў імкнецца добрасумленна выконваць усё, што ад іх патрабуецца.

Па законе ў калоніі можна различваць на два доўгатэрміновыя і два кароткатэрміновыя спатканні на год. Але


Аляксандр КАЗАКЕВІЧ чытае па 300 лістоў на дзень.

за прыкладныя паводзіны могуць заахвоціць дадатковымі спатканнямі. Правесці тры дні побач з блізкім чалавекам — запаветная мара любога асуджанага. Гасцініца хоць і на тэрыторыі калоніі, але ўмовы там амаль хатнія. Ёсць нават невялічкі дворык з кветнікам.

Тым, у каго сям'і няма, застаецца толькі марыць пра такія вось вакацыі. Доўгатэрміновыя спатканні дапускаюцца толькі з роднымі. Але ёсць магчымасць знайсці нявесту па перапісцы і ажаніцца. «Вяселлі ў нас не рэдкасць, — кажа Юрый Трутко. — Мы рыхтуем дакументы, да нас прыязджае работнік ЗАГСа і распісвае. Маладым замест мядовага месяца прадастаўляецца доўгатэрміновае спатканне. Наколькі моцныя такія шлюбы, казаць не бяруся, але некаторыя захоўваюць сям'ю пасля свайго вызвалення. На жаль, хапае і прыкладаў адваротных, калі распісаліся, развяліся і зноў ажаніліся. І так па 2-3 разы. Гэта больш характэрна для тых, хто сядзіць па 10—25 гадоў.

## 800 ЛІСТОЎ ЗА ДЗЕНЬ

У Аляксандра Казакевіча, інспектара аператыўнага аддзела, праца такая, што не засумуеш. Ён разам яшчэ з двума напарнікамі павінен вывучаць карэспандэнцыю. Калі сустракаецца нешта правакацыйнае, ліст вяртаюць аўтару для выпраўлення.

— Калі там нецэнзурная лаянка, мы не павінны прапускаць, — тлумачыць ён. — Гэта датычыцца і асуджаных, і тых, хто ім піша. Такое здараецца, на жаль, вельмі часта. Абкладці трохпавярховым могуць нават бацькоў, асабліва калі тыя пасылку не прыслалі своечасова або грошы не паклалі.

**Некаторыя знаёмствы заканчваюцца спатканнем, нават вяселлем. А для некаторых дастаткова і таго, што нехта будзе слаць пасылкі з волі. Калі ўвесь заробак ідзе на аліменты, застаецца толькі цэнуць на чыюсьці спагаду.**

Нельга таксама маляваць схему калоніі, пасылаць зробленыя на яе фоне фота. Гэта ўсё ж такі рэжымная ўстанова. Асабліва цяжка прыходзіцца на святы, калі на аднаго цэнзара прыпадаюць тысячы паштовак і лістоў на дзень. А так у сярэднім даводзіцца чытаць па 300 лістоў кожнаму. Інтэрнэту няма, але папера і ручка заўсёды пад рукой. Некаторыя могуць пагаварыць па тэлефоне і тут жа напісаць ліст. Каб выказаць усё, што не паспеў. Або размаўляў з дзяўчынай, але не пажадаў нешта казаць пры сведках. Бывае, усе эмоцыі ўмяшчаюцца на адной старонцы, а бывае, не хапае сшытка.

— Ёсць людзі, якія добра пішуць, чытаеш, як раман — прыгожа і даволі-такі шчыра, — усміхаецца Аляксандр Віктаравіч. — Вельмі часта пішуць пра каханне. Гэтага тут не хапае. І словы падбіраюць вельмі чулыя. Сумняваюся, што іх аднекуль спісваюць. Пад кальку і па некалькіх адрасах пішуць толькі тады, калі жадаюць пазнаёміцца. Так верагоднасць, што нехта адкажа, большая.

Некаторыя знаёмствы заканчваюцца спатканнем, нават вяселлем. А для некаторых дастаткова і таго, што нехта будзе слаць пасылкі з волі. Калі ўвесь заробак ідзе на аліменты, застаецца толькі цэнуць на чыюсьці спагаду.

## СПОРТ ЯК СРОДАК АД АГРЭСІІ

Інтэрнэт і мабільныя тэлефоны зняволеным замяняе насычаны вольны час. «Тэатр, тэлецэнтр, радыё, розныя конкурсы», — пералічвае начальнік аддзела папраўчага працэсу Валянцін Сакірка спосабы перавыхавання. Але найбольш вялікіх поспехаў асуджаныя дасягнулі ў спорце.

— Па гэтым кірунку калонія займае лідзіруючае месца, — адзначае ён. — Перавыхаваўчае значэнне спорту цяжка пераацаніць. Да нас часта прыязджаюць азлобленыя людзі, і спорт шмат каго прымірыў.

Тое, што гэта не простыя словы, пераконваюся на свае вочы. На адной з пляцовак ідзе такая гарачая гульня, што нават запавольваеш крок, каб дагледзець, хто ж мацнейшы. Валянцін Сакірка з задавальненнем дэманструе мне дзве трэнажорныя залы. Адчуваецца, на спорце тут не эканомяць.

— У калоніі штогод пры падтрымцы Беларускай федэрацыі бокса на чале з Дзмітрыем Ціхамолавым праводзіцца турнір па боксе, а таксама па ўсіх відах усходніх адзінаборстваў. Па тайскім боксе, вольнай барацьбе, армрэслінгу, бодзібілдынгу, сілавым трохбор'і. Пяты год запар праводзіцца турнір па хакеі паміж асуджанымі і прыезджымі камандамі. Першыя, хто дапамог арганізаваць такое мерапрыемства, — ветэраны хакея горада Бабруйска. У госці прыязджалі хакейныя клубы «Аматар», «Ва-банк», «Сокал». І нашы «Ледасекі» дэманструюць высокі клас, — уводзіць у курс справы мой суправаджальнік.

На вочы трапляе малады ўсмешлівы чалавек. «Гэта, лічы, Назара заслуга, — Валянцін Сакірка мяняе з мясцовай спартыўнай славутасцю. — Ён капітан каманды па хакеі ПК №2. Гэта яго дзецішча, ён яго ствараў, трэніраваў людзей, вучыў. Цяпер мы маем 15 дзейных гульцоў асноўнага складу».

У калоніі можна стаць сапраўдным спартсменам.


# НАДЗЕЯМІ

## Карэспандэнт «Звязды» наведала самую буйную папраўчую калонію

Няўзброеным вокам відаць, што Назар не проста жыве спортам, а дыхае ім. Сам ён хакеіст, але яму цікава ўсё — вялікі тэніс, футбол, баскетбол. А яшчэ займаецца тайскім боксам. Падлеткам трэніраваўся ў дзіцячай хакейнай школе ў Мінску. Потым жыццё пайшло з пакату. У калонію трапіў, калі яму было 19 гадоў. Цяпер 31. У хуткім часе на волю. Дома яго чакаюць маці, малодшыя брат і сястра. Вельмі перажывае за мінулае. Там цень былога зэка, забітага ім разам з напарнікам. Прызнаецца, што калі б у той час займаўся спортам, ніколі не пайшоў бы на злачынства. «Як сказаў адзін чалавек: агрэсія — прыкмета слабасці, — рэзюмуе ён. — А я малады быў, разышоўся на ўсе застаўкі — клубы, дыскатэкі. А там нічога добрага няма — распуста і алкаголь. Сёння лічу, лепш у хакей пагуляць, у басейн з'ездзіць. Зараз я знайшоў бы шмат чаго, чым можна заняцца».

**На жаль, хапае і прыкладаў адваротныя, калі распісаліся, развяліся і зноў ажаніліся. І так па 2-3 разы. Гэта больш характэрна для тых, хто сядзіць па 10-25 гадоў.**

«Калі гутарыш з тымі, хто мае вялікі тэрмін зняволення, відаць, як яны перажываюць, што так надоўга адарваны ад жыцця, — кажа Валянцін Сакірка. — Шмат хто з іх адначасова за гэты час стварыў сям'і, пабудаваў бізнес, нарадзіў дзяцей. Людзі шкадуюць, што праз сваё глупства марнуюць каштоўны час. Бо яны таксама маглі б ажаніцца, выхоўваць сыноў і дачок, працаваць, плаціць падаткі, прыносіць карысць грамадству».

— Мне тут сапраўды дапамаглі. Я быў дрэнны, але выправіўся, — адводзіць вочы Назар, і амаль фізічна адчуваеш, колькі ў гэтых словах болю за сваё мінулае.

### ІХ АБАГУЛЬНІЎ ЛЁС

Гэтыя людзі апынуліся за кратамі не выпадкова. Тут асабліва востра адчуваецца, што здараецца, калі забываеш, што такое закон. Магчыма, іх гісторыі стануць для кагосьці нагодай для роздуму. Бо, як выказаўся адзін з суразмоўцаў, ніякія багацці свету не вартыя таго, каб апынуцца тут.

Сяргей — адзін з беларусаў, які доўгі час знаходзіўся ў вядомым расійскім тэлепраекце і стаў там чалавекам года. А цяпер вось ужо год, як ён адбывае пакаранне ў калоніі. Засталося яшчэ 2.

— Калонія — гэта не здымачная пляцоўка, тут усё паіншаму, — уздыхае ён. — Тут пачынаеш пераасэнсоўваць усё сваё жыццё і вельмі востра адчуваеш, хто табе сапраўды блізкі і дарагі. Тут я зразумеў, што трэба мяняць круг зносін, максімальна звужаць яго.

Сяргею асабліва не хапае блізкіх людзей, зносін з маці. Не хапае яе позірку, усмешкі. На лаўцы падсудных ён апынуўся нечакана для сябе. Працаваў юрыстам у Маскве, аднойчы аказаў юрыдычную дапамогу сябру, які займаўся продажам машын. І пайшоў як саўдзельнік. «Каб трапіць сюды, зусім не абавязкова самому ўчыніць злачынства, можна аказаць дапамогу злачынцу і апынуцца ў пастцы. Таму лепш нікуды не ўлазіць, — перажывае ён і дадае: — У мяне з'явілася вялікае жаданне працаваць, павышаць узровень ведаў, бо я зняславіў сваіх блізкіх, сям'ю.

Нядаўна БТ здымала тут мерапрыемства, прысвечанае Дню незалежнасці і Міжнароднаму дню барацьбы з наркотыкамі. 13 чэрвеня пры падтрымцы Федэрацый бокса і бодзібілдынгу прайшлі паказальныя выступленні па гэтых відах спорту. У іх прымалі ўдзел сапраўдныя «зоркі» — беларускі баец муай-тай Дзмітрый Валент і майстар спорту міжнароднага класа, чэмпіён Еўропы сярод аматараў і прафесіяналаў Максім Маруга.

Разумею, што ад турмы ніхто не застрахаваны, але ад гэтага не лягчэй. Хочацца хутчэй выйсці і паказаць, што я не стаў горшым».

Руслан працуе ў храме ў гонар Іаана Прадцечы. Гэта адно з месцаў калоніі, куды асабліва часта звяртаюцца забойцы. Руслан пайшоў далей, ён стаў старастам. У калоніі ўжо 9 гадоў, нясе крыж за асабліва цяжкае злачынства — забойства. Напярэдзе яшчэ 9 гадоў. «У душы кожны перажывае за ўчыненае, кожны баіцца кары Божай, — прызнаецца ён. — Я не выключэнне. Нясу послух, чытаю малітвы, спяваюся. Спадзяюся, што Бог даруе мне гэты грэх. Да калоніі ў царкву хадзіў ад выпадку да выпадку, а тут уцаркавіўся. Тут прасцей, а на волі шмат спакус».

Віталя дома чакае сям'я, яго дачцэ споўнілася 5 гадоў — роўна столькі, колькі ён тут знаходзіцца. Да вызвалення засталося яшчэ крыху болей чым 2 гады. Спадзяецца, што зможа жыць далей без марыхуаны і амфітамінаў, за якія заплаціў воляй. «За такі вялікі перыяд цвярозасці ўпершыню ўбачыў, як шмат існуе вакол карысных рэчаў. Спорт, напрыклад, — прызнаецца ён. — Я не хацеў бы, каб мае дзеці ўжывалі наркотыкі, алкаголь і нават цыгарэты. Гэтыя рэчывы звужаюць светапогляд, абмяжоўваюць у развіцці. Раней раздражняўся, псіхаваў. Цяпер стаў спакайнейшы. Былі перыяды, калі я ўжываў наркотыкі, не аддаючы сабе справаздачы. А потым думаў: навошта? Дома адбываліся скандалы, я раскайваўся, але потым зноў браўся за сваё. Спадзяюся, што яшчэ паспею правільна выхаваць сваіх дзяцей».

Уладзіміра да турмы таксама давялі наркотыкі. «Падставіў чалавек, які сам жа мне іх і прадаваў, — цяжка ўздыхае ён. — Перад міліцыянерамі выдаў мяне за распаўсюджвальніка». Зараз Уладзімір сам сочыць за маральным станам у атрадзе. «Бывае, людзі духам падаюць, прыходзіцца супакойваць, — кажа ён і дадае. — Ніводнае задавальненне не каштуе таго, што мы тут адчуваем. На жаль, гэта ўсведамленне прыйшло да мяне толькі тут».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

**Фота аўтара і з архіваў ПК №2.**

У калоніі ўсё робіцца з выхаваўчым ухілам.






Абраз у гонар святога апекуна калоніі — Іаана Прадцечы.


**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
| --- | --- |
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, земельный участок, на котором расположен объект** | - капитальное строение, инв. № 441/С-12234 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание картофелехранилища), площадью 731,7 кв.м, расположенное по адресу: Ивьевский р-н, г.п. Юратишки, пер. Промышленный, 9Е. Капитальное строение расположено на земельном участке, кадастровый номер 422955700001000617 (назначение – земельный участок для обслуживания картофелехранилища), площадью 0,3903 га, расположенном по адресу: Ивьевский р-н, г.п. Юратишки, пер. Промышленный, 9Е; - капитальное строение, инв. № 441/С-12219 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада тары), площадью 365,8 кв.м, расположенное по адресу: Ивьевский р-н, г.п. Юратишки, пер. Промышленный, 9Н. Капитальное строение расположено на земельном участке, кадастровый номер 422955700001000622 (назначение – земельный участок для обслуживания тарного склада металлического), площадью 0,0788 га, расположенном по адресу: Ивьевский р-н, г.п. Юратишки, пер. Промышленный, 9Н; - капитальное строение, инв. № 441/С-12225 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание пристройки к насосной), площадью 211,4 кв.м, расположенное по адресу: Ивьевский р-н, г.п. Юратишки, пер. Промышленный, 9М. Капитальное строение расположено на земельном участке, кадастровый номер 422955700001000621 (назначение – земельный участок для обслуживания пристройки к насосной), площадью 0,9342 га, расположенном по адресу: Ивьевский р-н, г.п. Юратишки, пер. Промышленный, 9М; - капитальное строение, инв. № 441/С-12226 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание насосной), площадью 10,5 кв.м, расположенное по адресу: Ивьевский р-н, г.п. Юратишки, пер. Промышленный, 9Г. Капитальное строение расположено на земельном участке, кадастровый номер 422955700001000612 (назначение – земельный участок для обслуживания насосной кирпичной), площадью 0,1330 га, расположенном по адресу: Ивьевский р-н, г.п. Юратишки, пер. Промышленный, 9Г; - капитальное строение, инв. № 441/С-12227 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание насосной), площадью 141,1 кв.м, расположенное по адресу: Ивьевский р-н, г.п. Юратишки, пер. Промышленный, 9Р. Капитальное строение расположено на земельном участке, кадастровый номер 422955700001000613 (назначение – земельный участок для обслуживания насосной кирпичной), площадью 0,2713 га, расположенном по адресу: Ивьевский р-н, г.п. Юратишки, пер. Промышленный, 9Р; - капитальное строение, инв. № 441/С-13474 (назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – водопроводная сеть), площадью 0,0 кв.м, расположенное по адресу: Ивьевский р-н, г.п. Юратишки, пер. Промышленный, водопроводная сеть к зданию насосной |
| **Начальная цена продажи** | 78153,60 р. (семьдесят восемь тысяч сто пятьдесят три рубля шестьдесят копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 7 815,36 р. (семь тысяч восемьсот пятнадцать рублей тридцать шесть копеек) |
| **Продавец** | Ивьевский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231337, Гродненская область, г. Ивье, ул. Энгельса, 5, тел. 2-11-67, факс 2-23-95 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| **Условия аукциона** | Расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возложить на Покупателя. Право собственности переходит к Покупателю после передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру». Документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи. Расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения, и публикации извещения в средствах массовой информации и размещения на официальном сайте, возмещаются Победителем аукциона Ивьевскому филиалу Гродненского областного потребительского общества |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 19 июля 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 02.12.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 13 июля 2016 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**Дополнительная информация: http://grodnoino.by/**

■ Простая мова

# Усё, што ты робіш для іншых...

**Чэрвень... Спёка. Невыносна цяжка ў горадзе, на асфальце! Не лягчэй, відаць, і ў вёсках, штодня паліваючы грады.**

**— За цэлы месяц, не паверыце, у нас — аніводнага даждзюсіку! — скардзіцца сяброўка з Рагачоўшчыны.**

**...Гэта ж колькі трэба вады перацягаць, каб прыдумаць такое слова?**

## СВЯТА

У мястэчку новая крама — з так званым самаабслугоўваннем, што, відаць, нязвыкла (ва ўсякім разе пакуль), бо многія на ўваходзе тармозяць — аглядаюцца, неяк нясмела бяруць спецыяльныя кошыкі, потым самі, з бачным задавальненнем, выбіраюць патрэбнае, спыняюцца каля кас.

Там — чарга, што, падобна, зусім не бянтэжыць, бо побач ці не ўсе свае — можна пагаварыць. Да таго ж, па абодва бакі — паліцы з таварам, з аднаго — у прыватнасці — нават з адмысловым: з вінамі, гарэлкай. І ўжо выбар там...

У нейкага дзядзькі аж вочы разбегліся: то адну пляшку возьме, у кош свой паставіць, то перадумаўшы, верне назад, пацягне руку да другой, да трэцяй...

— Што ты там варожыш? — не разумее яго прыяцель. — Чарга падыходзіць... Любую бяры!

— Атрута і там, і там, — устаўляе сваё «тры капейкі» нейкая з кабет. — З адной бочкі, відаць, разліваюць — толькі ў пляшкі розныя... І прадаюць па рознай цане, каб з вас, дурняў, грошыкі браць.

— Э-э, баба, ты не скажы, — падняўшы ўгору ўказальны палец і агаліўшы шчарбаты рот, пярэчыць ёй той пераборлівы пакупнік. — Вось гэта гарэлачка павінна быць мякчэйшая!

— А ты дык дагэтуль цвёрдыя піў? Аж зубы на іх зламаліся... Тады правільна: выбірай мякчэйшую, каб не жаваць...

Чарга заходзіцца ад рогату. Свята, можна сказаць, — у мястэчку новая крама.

## ЖАБА?

З правілаў жыцця: калі вы селі ў крэсла да цырульніка, і той, не пагледзеўшы на вас і нічога не спытаўшы, бярэцца мыць галаву — уцякайце, бо майстар гэта, хутчэй за ўсё, неважнецкі... Як, дарэчы, і доктар, што ў першыя ж хвіліны прыёму і толькі адзін раз мерае ціск, бо на добры толк трэба два... І на розных руках...

Леў Міхайлавіч так і робіць.

На прыборы — бачыць — 80 на 40.

— Чым займаецеся? — пытае ў сваёй пацыенткі.

— З дзеткамі працую.

— Трэба разумець, да такога вось стану школа давяла?

— Не... Я дзяцей аднаго багацея вучу — дома ў іх...

— Дык гэта вас жаба душыць?!

— З чаго вы ўзялі? — крыўдзіцца маладзіца, зрываючы з рукі манжэту.

Але ж позна: доктар паспеў заўважыць, што ў гэты момант ціск у яе падняўся да нормы.

Значыць, «дыягназ» правільны?

## ...ЯК НЕКАЛІ

У двары і сірацінкай, можна сказаць, помнік «мінуўшчыны»: тэлефонаўтамат. Некалі, гадоў 30-40 таму, у гарадах (не кажучы ўжо пра вёскі) іх не хапала — людзі, каб пазваніць, сталі ў чэргах. Цяпер — зрэдчас карыстаюцца. Ды яно і зразумела — ці не кожны з мабільнікам; хатнія нумары амаль не набіраеш...

Але ж — калі такое здараецца, — то з задавальненнем, бо ўяўляецца, «бачыцца» не толькі сам чалавек, але і дом яго, чуюцца галасы сямейнікаў.

— Лёнечка, гэта цябе, — зняўшы слухаўку, гаворыць, напрыклад, жонка спадара К.

Што цалкам лагічна і зразумела, бо гэта для мяне ды іншых ён шаноўны Леанід Мікалаевіч, дзевяностагадовы ветэран Вялікай Айчыннай. А для яе — па-ранейшаму Лёнечка.

Што, згадзіцеся, дарагога каштуе!

## ДАРМО, ШТО ВІДАЦЬ...

Недзе ў азіяцкіх краях з чаем любяць цырымоніцца: гэта значыць, заварваць нешта адмысловае, у адпаведным посудзе, пэўным чынам, потым — за прыемнымі размовамі і смакуючы — доўга піць.

У нас жа часу няма, а тым болей зранку: у нас заварку кіпнем заліў, спадачкам прыкрыў, трошкі пачакаў і гатова: пі сабе. Праўда, найперш...

Сяброўка з дапамогай лыжачкі выціскае, «выкручвае» свой пакецік з гарбатай, і (дарэчы ж прыйшлося) расказвае, што (канкрэтна) з такім вось «спітым» пакецікам робяць у Швецыі.

Выкідваюць? Ну, вядома ж, але не проста, а... сартуючы па відах смецця. Гэта значыць, паперку з назвай чаю (макулатуру, два-тры квадратныя сантыметрыкі) кладуць у адну ёмістасць, нітачку (тэкстыль) — у другую, саму заварку (арганіку) — у трэцюю, пакецік — у чацвёртую. Во гаспадары — яны...

Што мы?

Выбегшы з пад'езда пасля таго чаяпіцця, новымі вачыма, як той казаў, паглядзела на паўнюткі кантэйнер са смеццем. І чаго ж толькі там не ўбачыла!

З самага верху, у прыватнасці, ляжалі вялікія бляшанкі ад фарбы (металалом), побач — бутэлькі ад піва і шампанскага (шкло, якое не гніе ніколі!), там жа — безліч розных пакетаў і пакецікаў, мужчынскі туфель, рыззё... Карацей — усё разам, бо мы яшчэ толькі спрабуем, толькі вучымся сартаваць сваё смецце. І да Швецыі пакуль, як да Месяца.

## МЫ НЕ ДАГОНІМ?

Ніла Гілевіча (светлай памяці!) некалі дужа ўсхваляваў артыкул у часопісе «Москва» (1991, №7), прысвечаны праблемам школьнага выхавання ў Амерыцы. У ім дзве таблічкі былі прыведзены: у першай — пералік праблем, якія найбольш хвалявалі настаўнікаў у 1940 годзе, у другой — у 1988-м.

Велізарная розніца, бо ў адным «слупку» былі размовы на ўроках, жаванне жвачкі, шум, беганіна па калідорах, незахаванне чаргі (у буфеце ці яшчэ дзе), адзенне не па правілах, раскіданне смецця. У другім, праз 48 гадоў, на першы план выйшла злоўжыванне наркотыкамі і алкаголем, цяжарнасці і гвалтаванні вучаніц, самагубствы, абрабаванні, збіванне...

Не ведаю, ці рабіліся такія апытанні ў нас раней і ці будуць праводзіцца зараз? І што пакажуць?

Хай Бог дае, каб сапраўды адсталі мы ад той Амерыкі.

І ніколі яе не дагналі.

## БЕЗ АДКАЗУ

Кажуць, дзвюх кабет асудзілі — далі па тры гады. Але дамоў яны вярнуліся праз шэсць, бо яшчэ тры прастаялі каля сцен турмы — не маглі разысціся: не пра ўсё пагаварылі...

Вось і гэтыя дзве не маўчаць — па дарозе з работы.

— Чула, што ты сына ажаніла. Асобна жывуць? — пытае маладзейшая. — Дык ці добра ж?

Старэйшая заклапочана адводзіць вочы, нейкі час маўчыць, потым махае рукой:

— Ат, хіба ў іх разбярэш? Ён мне кажа, што добра, што яму падабаецца. Але ж я не сляпая... Дома ў нас — ты ведаеш — і памыта ўсё, і прыбрана, і прыгатавана. У халадзільніку заўсёды нейкі боршчык, катлеты, кампот. А там... Кава ў іх на снеданне (каб жа хоць з бутэрбродамі!)... На вячэру — піца... Кур'еры прывозяць — гатовую...

Кажу ім: «Вы ж бы — каторы — сталі да пліты, самі нешта сабе згатавалі. І смачней было б, і здаравей, і танней... Нявестка ў крыўду. Кажа: «Мы зарабляем!» Я ім: «Дык траціце ж з розумам!» Яна: «А я, маўляў, не дурная: лепей грошы свае, чым час — чорт ведае на што...» Не паверыш: над гэтымі словамі каторы дзянёк ужо думаю: зразумець не магу, хто з нас дурны, хто разумны?

І сапраўды — пытанне!

## УСЁ ЗМЯШАЛАСЯ...

З нашага невялічкага райцэнтра група «таварышаў» на «шабашку» паехала — у Расію. Будавалі адзін аб'ект, жылі ў адным інтэрнаце, па вечарах — адпаведна — збіраліся за адным сталом, гаманілі.

І падчас гэтых размоў неяк выпадкова высветлілася, што ў брыгадзе Танін першы муж і Танін другі... Мала гэтага: там жа яшчэ і прымака, які прыбіўся да першай жонкі Танінага другога...

Усё змяшалася, карацей... І, падобна, страшней, чым у доме Аблонскіх.

## ГАНЬБА?

У Міхайлаўны радасць, хоць і была: сын у водпуск прыязджаў — аж з саменькай Масквы!

У першыя дні, пакуль холад стаяў, ён у хаце столь пафарбаваў, шпалеры паклеіў. А потым разам з матуляй выйшлі плот гарадзіць і пры гэтым, ну вядома ж, размаўляць — пра сваё, жыццёвае, па-свойску, па-беларуску...

Суседка іх размовы «падслухала», па вёсцы панесла:

— Міхайлаўна — чалавек як чалавек. І сын яе, відаць, таксама: і ў школе добра вучыўся, і ў вялікім горадзе жыве... Але ж — бач ты — па-іхняму, па-гарадскому, і двух слоў не звяжа!

## ЛЮДЗІ І РЭЧЫ

Адзін стары кавалер зарабляў неблагія грошы, меў кватэру ў горадзе, але потым вярнуўся ў вёску: абжыў бацькоўскую хату, машыну займеў, накупляў сабе розная тэхнікі — новы тэлевізар, халадзільнік, мікрахвалёўку, пыласос ды... засумаваў, — стаў зазіраць у чарку. І тады ўжо дзверы ў яго дом не зачыняліся: хто хацеў, — заходзіў, што падабалася, браў...

Так што праспаўся неяк гаспадар, абышоў сялібу і вачам не паверыў. Зазірнуў да суседзяў: спытаў, можа, чулі яны што, можа, бачылі? «Не, — сказалі, — нічога не ведаем» (бо і самі ж, напэўна, бралі)...

Расстроіўся чалавек, пашкадаваў свайго дабра, бо яно ж мазалём нажытае — дарма ніхто нічога не даў...

Потым — парадаваўся, што хоць нешта ды яшчэ засталося і... завязаў — кінуў піць, каб не страціць апошняе.

## УСЁ, ШТО ТЫ РОБІШ ДЛЯ ІНШЫХ...

Тая паездка ў Прагу была вельмі нечаканай і гэткай жа кароткай, бо што там убачыш за некалькі дзён (тым болей — зімовых), што прывязеш у якасці падарункаў?

Грэх на душы: усё і для ўсіх выбірала ўпохапкі, перад самым ад'ездам. Потым, чырванеючы, аддавала і прымала падзякі, не вельмі верачы ў шчырасць. Хоць гэта і дарэмна, бо хустка для мамы і сапраўды была незвычайнай: нейкай вельмі пяшчотнай (да твару, да шыі), да таго ж — не вялікай і не малой, не сказаць, каб цёплай і зусім не халоднай... Больш за тое: у яе, у гэтай хустцы, была дзіўная ўласцівасць пасаваць па колеры да ўсяго: і да шэрага паліто, і да зялёнай кофты, і да вішнёвай курткі... Так што мама (светлай памяці!) насіла яе ці не круглы год...

Цяпер у той пражскай хустцы (добрая мода накручваць нешта на шыю!) фаршу сама.

Прытча з нагоды. Цясляр адзін стаміўся рубіць дамы — сказаў свайму начальніку, што хоча сысці: пабыць нарэшце з унукамі, паглядзець на свет...

Начальнік зразумеў яго, і, хоць вельмі шкадаваў адпускаць, папрасіў зрубіць яшчэ адзін дом — апошні.

Што было рабіць: хоць-нехаць той цесля згадзіўся, хоць-нехаць стаў і працаваць: гэта значыць, не дужа думаў ды падбіраў бярвёны, шмат дзе спяшаўся, будаваў, абы з рук хутчэй...

І вось справа скончана. Час развітання: начальнік шчыра дзякуе цесляру за ўсё, што той зрабіў, і — за шматгадовую сумленную працу — уручае яму... ключы ад таго самага апошняга дома, са словамі: «Ён — твой. Прымі яго ў падарунак...»

«Якая трагедыя, які сорам! — жахаецца майстар. — Я, паставіўшы столькі ўзорных бездакорных дамоў, сам павінен жыць у такім паганым... Ды каб жа я ведаў, што так абернецца, што раблю гэты дом для сябе, я б тады...»

Не ведаў ён, не ведала я ды і вы, магчыма: усё, што мы робім для іншых, мы робім для сябе.

**Валянціна ДОЎНАР.**

*dounar@zviazda.by*

# «Модны прысуд» бабы Франі

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Далей — болей. Калісьці пасадзіла Франя Іванаўна каля брамкі блакітныя елкі. Калі дрэвы падраслі, гаспадыня вырашыла паставіць пад яловымі лапкамі Дзеда Мароза і Снягурку — якраз набліжаўся Новы год. Аднавяскоўцы ацанілі казачную інсталяцыю Франі. Потым пашыла і прыбрала Бурацiну, Дзіка, Рыбака, Лесніка-дрывасека, Салдата, Паляўнічага. Праўда, у апошняга героя нехта зняў з пляча «стрэльбу» (ён і дагэтуль стаіць без яе).

Сваіх лялек-людзей майстрыха выrabляе са звычайнай тканіны, робіць каркас, набівае сенам. Паверх лялькі апранае адзежу, якую ёй прыносяць прыхільнікі яе творчасці, добразычліўцы. Напрыканцы размалёўвае фарбамі твар, надае яму эмоцыі і здаровы выгляд. Усе «людзі» атрымліваюцца ў натуральную велічыню, у натуральных позах — так патрабуе вопратка, дыктуе мода.

Не раз пазычалі герояў з брылёўскай калекцыі на раённыя святы і нават на «Дажынкі». Давалі Франі і заказы на выраб нейкай знакамітай асобы. А ўжо колькі турыстаў прыязджала, нават з замежжа, цяжка падлічыць. Улетку Франя Іванаўна ўсё больш праводзіць часу на агародзе — трэба збіраць жукоў і рваць пустазелле, даглядаць козачак і іншую жыўнасць. І толькі пры неабходнасці (калі хто папросіць) альбо ў рэдкія хвіліны адпачынку яна бярэ гармонік і ўспамінае песні свае маладосці.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**

**Фота аўтара.**

*Бярэзінскі раён.*







# ДЗЕ ПАСЕЕШ ГУСТА, ТАМ НЕ БУДЗЕ ПУСТА



## «АГАРОД ЛЮБІЦЬ ГАРБАТУЮ»

У XIX стагоддзі самымі папулярнымі ў агародах былі капуста, буракі, морква, бручка. Да бульбы галоўнай культурай была рэпа. Сяляне ў той час салатаў многа не ведалі, рабілі іх з агуркоў, кропу, радыскі, якую звалі «французскай агароднінай», часта ў дакументах згадваецца агурковая трава. Папулярным быў і тапінамбур — яно і зразумела, гэтая культура дае багаты ўраджай, добра захоўваецца і ўвесну служыць крыніцай вітамінаў. Але вырошчвалі яго не паўсюдна. Напрыклад, у асобных магілёўскіх вёсках нават не ведалі гэтай культуры.

Памідоры ў XIX стагоддзі (ды і нават у пачатку XX) былі вялікай рэдкасцю. Можна сказаць, што актыўна вырошчваць іх у нас пачалі толькі пасля Вялікай Айчыннай вайны. А вось звестак пра перац даследчыца ў старадаўніх дакументах наогул не знайшла — напэўна, раней яго тут не садзілі. Затое ў XIX стагоддзі на Беларусі раслі ананасы і лімоны. У панскіх маёнтках былі аранжарэі, дзе збіралі ўраджаі розных экзатычных раслін.

А вось кавуны і дыні маглі выспяваць не толькі ў шляхцічаў, але і сялян, асабліва ў паўднёвай частцы, на Палессі. Этнограф сустракала звесткі, што нават на Магілёўшчыне на пачатку XX стагоддзя сеялі кавуны і салілі іх у бочках.

Пра гарох казалі, што ён «сеецца і на прахадзяшчага і на прабягашчага і на тыя дзеці, што праз плот глядзеце».

Але лезці ў чужы агарод заўсёды лічылася непрыстойным.

— Вёска жыла па сваіх законах. У сялянскай традыцыі прынята было паважаць адно аднаго, і на чужую маёмасць ніхто не пасягаў. Дзверы ў хатах не зачыняліся. Нават у сярэдзіне XX стагоддзя на іх яшчэ замкі не вешалі, — заўважае Любоў Васілеўна. — Уласна, і фарміраваліся вёскі напачатку са сваяцкіх сем'яў, часта ў насельнікаў прозвішчы былі аднолькавыя. Напэўна таму і выпрацоўвалася павага да суседзяў і адмоўнае стаўленне да зладзеяў.

Вядома ж, у панскіх маёнтках была большая разнастайнасць агародных культур і адтуль некаторыя з іх паступова «засяляліся» і на сялянскія агароды. Напрыклад, пятрушку, якая раней не была шырокавядомай культурай, маглі вырошчваць сяляне. На думку этнографа, многаму ў агародніцтве вучыла шляхта. Бо яна шмат падарожнічала, часта бывала ў Заходняй Еўропе і, канешне, адтуль везла розныя культуры. Сяляне працавалі ў яе, знаёміліся з вопытам, часам разжываліся насеннем. Не дзіва, што нават садовыя дрэвы, якія не лічацца тыповымі для нашай краіны, як чарэшні, персікі, абрыкосы маглі расці і ў іх. Агародам займаліся жанчыны, на Беларусі нават казалі, што «агарод любіць гарбатую бабу».


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вядома ж, сяляне, якія жылі ў прыгарадных вёсках ці гарадах і мелі па ўскрайках надзелы, былі ў выйгрышных умовах. Яны сваю прадукцыю маглі прадаваць. За ўтаргаваныя за зеляніну грошы, напрыклад, можна было набыць тканіну, хусткі, пацеркі. У даўніну, як і цяпер, часта наракалі на насенне. Яго спрабавалі вырошчваць самі і куплялі на кірмашах. Захаваліся нават звесткі, што людзі судзіліся з-за купленага насення, якое не ўзышло. У XIX стагоддзі ўжо былі лейкі, рыдлёўкі (у той час іх звалі рыдлі). Сяляне іх рабілі на ўзор нямецкіх прылад, якія набывала шляхта. Дарэчы, першыя рыдлёўкі былі драўляныя і жалезам абіваліся па краях.

## ПЕРШАЯ СТРАВА НАЗЫВАЛАСЯ «КАПУСТАЙ»

Беларусы вырошчвалі агародніну не толькі на лёхах (так звалі грады). Традыцыйна склалася, што многія культуры сеялі вялікімі загонамі (гонамі). Прычым так садзілі не толькі бульбу, але і капусту, буракі. Нават і сёння на вёсках можна ўбачыць, як уздоўж агарода сядзяць дзве доўгія паласы капусты. Між іншым, капуста была адной з асноўных агародных культур. Невыпадкова часта першая страва на Беларусі называлася «капустай». Наўрад ці гэта культура выспявала, калі б яе сеялі адразу ў грунт.

**Да бульбы галоўнай культурай была рэпа.**

— Расаду, напэўна, вырошчвалі з самага пачатку. Я так мяркую, таму што ў XVI стагоддзі ў актавых матэрыялах часта згадваюцца рассаднікі, — раскажвае Любоў Васілеўна. — Звычайна іх рабілі каля хаты, на сонечным баку. Капалі яму, якую добра ўгнойвалі. Вядома, шкла тады не было, сяляне рабілі спецыяльныя маты (звычайна з саломы), якімі ўкрывалі пасадкі.

***— Ці былі на Беларусі бульбяныя бунты?***

— Мы часта змешваем гісторыю Беларусі і Расіі. У расійскіх сялян сапраўды былі бульбяныя бунты супраць увядзення гэтай культуры, — заўважае Любоў Васілеўна. — Я не сустрэла ніводнага факта, калі беларускія сяляне выступалі супраць бульбы. Яна хутка прыжылася на Беларусі. Калі здараўся няўрод, былі дрэнныя прыродныя ўмовы (дождж, град) і іншыя культуры гінулі, дык бульба ўраджай давала ў любы год. Да 70-х гадоў XIX стагоддзя 25 працэнтаў ад валавага прадукту па ўсёй Расійскай імперыі па бульбе прыходзілася на Беларусь. З яе сталі гнаць спірт, шалупінне ішло на корм жывёле. Калі я глядзела дакументы Нацыянальнага архіва ў Гродне, знайшла заканадаўчыя акты 30—40-х гадоў XIX стагоддзя, якія сведчаць, што выдаваліся спецыяльныя брашуры, дзе аграномы навучалі сялян, як садзіць бульбу. Праўда, некаторыя з тых парад былі няправільнымі. Напрыклад, тады рэкамендавалі, калі бульба крыху вырасце, пакінуць 2 сцябліны, а астатнія адшчыпваць. На самай справе, чым больш сцяблін, тым багацейшы ўраджай.

Калі бульба вырастала сантыметраў на 10, яе акучвалі — з двух бакоў праганялі плугам. А потым жанчыны ці дзеці ішлі яе «падглядаць» — адгортвалі сцябліны, якія былі прысыпаны зямлёй. І гэта была памылка, між іншым, многія яе робяць і сёння. Практыка паказала, сцябліны вельмі добра акучваць «з галавой», так болей каранёў фарміруецца і большы будзе ўраджай.

***— Калі бульба замяніла рэпу, ці пачаў мяняцца характар беларусаў?***

— Ёсць такое меркаванне, быццам яны сталі больш памяркоўнымі, спакойнымі, але доказаў таму няма. Рысы характару беларусаў: працавітасць, добрыя адносіны да прыроды, — выпрацоўваліся ў практычнай дзейнасці. Праз працу на агародзе закладваліся і павага да продкаў — «трэба рабіць, як дзяды рабілі» і выхаванне надзвычай працавітага чалавека. Да 18 гадоў хлопцы і дзяўчаты павінны былі авалодаць усімі відамі работ. У беларускай традыцыі дзеці пачыналі працаваць з 4-5 гадоў. Але і самаму простаму трэба было вучыць. Напрыклад, пер'е цыбулі нельга рваць з сярэдзіны, а толькі па краях, бо цыбуля расці не будзе. Дзіцяці давалі нейкую маленькую градку, каб яно магло пасадзіць, што хоча. Гэта можна параўнаць з Вальдорфскімі школамі, у якіх вучні пад наглядам настаўнікаў вырошчвалі розныя культуры...

Акрамя таго, матэрыяльная культура заўсёды мела духоўныя складнікі. Жыццё было прасякнута фальклорам, прычым яшчэ да 60-70-х гадоў XX стагоддзя. Знямоглыя пасля напружанага дня, жанчыны вярталіся з поля і спявалі. Можа ад таго і былі песні такімі працяжнымі, што ў беларусаў не было лёгкага хлеба. Працавалі ж ад відна да цямна. Валоку (гэта амаль 22 га зямлі) звычайна апрацоўвалі 2 сям'і. Дастацца зямля магла розная, часта бедная, зараслая кустоўем. Ляды трэба было высякаць, выпальваць. Так, валокі былі добрыя, сярэднія і «подлыя». А за іх трэба было яшчэ ў паноў адпрацоўваць — акрамя паншчыны былі «талокі», «гвалты», надзвычайныя павіннасці.

Калі падводзіла надвор'е, людзі лічылі гэта пакараннем за грахі, непрытрымліванне пастоў.

— Анамальныя з'явы былі і раней, гэта ёсць у летапісах. Я знаходзіла звесткі, што, напрыклад, у канцы XVI — XVII стагоддзі некалькі гадоў запар здараліся няўроды, — расказвае Любоў Ракава. — Мог снег у чэрвені выпасці на два тыдні, і пасадкі гінулі. Сустракала інфармацыю, што ў студзені квітнелі сады.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Парады з мінулага

Капуста, морква, буракі могуць добра расці загонамі. Нават лепей, чым на градках, бо раслінам хапае сонца.

**Цыбулю і моркву здавён селяць побач або робяць змешаныя пасадкі. Каноплі ў міжрадкоўі капусты адпуджвалі вусеняў. Дарэчы, канопляў у былыя часы на вёсцы сеялі многа, з іх рабілі вяроўкі, шчыльнае палатно, якое ішло на мужчынскія сарочкі.**

Высакарослыя расліны выкарыстоўвалі для абароны больш далікатных. Так, градкі абсаджвалі бобам, гарохам, фасоляй. І сёння агароднікі прыкмячаюць, што суседства бобу на карысць таматам, агуркам і бульбе. А вось побач з цыбуляй боб садзіць не пажадана. З фасоляй не ўжываюцца буракі і часнок. Несумяшчальныя бульба і клубніцы.

**Народны каляндар быў павязаны на агародніцкай працы, многія работы прымяркоўваліся да пэўных свят. Напэўна, так лягчэй было запомніць. Асобных традыцый руплівыя гаспадары прытрымліваюцца і зараз. Так, кажуць «пасадзі агуркі на Пахом, вырастуць мяхом».**

— Свякроў расказвала, як пасадзіла агуркі на Пахома, раніцай устала, а невялікі снег запарушыў зямлю, — успамінае Любоў Васілеўна. — Насенне аказалася ў холадзе. Сёння мы ведаем, што гэта можа быць добрай закалкай раслін. І ў той год такія былі агуркі, як ніколі.

**З агародніцтвам было звязана шмат вераванняў і абрадаў. Напрыклад, былі забароны на дачу пазыкі ў час пасеву. Лічылі падобнае выклікае падобнае, што гэта будзе адыход з гаспадаркі даброт. Нават калі гной вывозілі, глядзелі ці не апярэдзіў у гэтай рабоце сусед.**

Былі і асобныя абрады, якія хутчэй можна ўспрымаць, як жартоўныя. Напрыклад, жанчыны, калі ішлі садзіць капусту, пэўным чынам наматвалі на галаву намітку, каб качаны былі вялікія. Мужчыны бегалі голымі вакол градак з агуркамі, каб тыя добра раслі. На «доўгага Івана», калі садзілі гародніну, высока падымалі спадніцы, каб усё вышэй расло і хапалася за калена, каб было тоўстае і круглае.

## Партугалія і Францыя — у фінале

У першым паўфінале партугальцы абгулялі зборную Уэльса з лікам 2:0, галы забілі Крыштыяну Раналду і Нані. У другім матчы 1/2 гаспадары чэмпіянату французы з такім жа лікам перамаглі дзеючых чэмпіёнаў свету — каманду Германіі. Сапраўдным героем гэтага паядынку стаў Антуан Грызман: спачатку ён рэалізаваў пенальці, а затым адправіў мяч у сетку і з гульні.

— Мы ўжо ўвайшлі ў гісторыю. Францыя вельмі доўга не перамагала Германію, але гэта не мела ніякага значэння. Мы ў фінале, і лёс трафея ў нашых руках. Я рады за гульцоў. Гэта быў найцяжэйшы матч супраць каманды, якая прымушала нас трываць, але мы трывалі разам. Гульцы перапісалі гісторыю, выбіўшы Германію з турніру. У нас няма сілы вырашаць праблемы людзей, але мы можам падарыць ім эмоцыі, каб яны забыліся пра свае трывогі. Мы дорым запал і энтузіязм, і мы бачым гэта, — сказаў пасля паядынку **галоўны трэнер французаў Дыд'е Дэшам.**

Фінал чэмпіянату Еўропы пройдзе 10 ліпеня на стадыёне «Стад дэ Франс» у прыгарадзе Парыжа Сен-Дэні.

## Паўфінал каля Эйфелевай вежы паглядзелі 90 тысяч

Гульню паміж зборнымі Францыі і Германіі ў фан-зоне каля Эйфелевай вежы паглядзелі 90 тысяч чалавек. А святкаваць перамогу пасля матча на вуліцы Парыжа выйшлі дзясяткі тысяч заўзятараў. Не абышлося без інцыдэнтаў: моладзь на вуліцах французскай сталіцы закідала паліцыю феерверкамі, бутэлькамі, камянямі і іншымі прадметамі, а праваахоўнікі ўжылі слязісты газ. Сутыкненні маладых людзей з паліцыяй адбыліся на Елісейскіх палях, якія супрацоўнікі праваахоўных органаў пастараліся перакрыць сваімі аўтамабілямі, каб не дапусціць праходу ўзбуджанага натоўпу да месцаў, папулярных сярод турыстаў.

## Новы герой

Антуан Грызман паказаў другі лепшы вынік па ліку галоў на адным Еўра. Дубль у вароты Германіі даваў лік забітых ім мячоў на турніры да шасці. Раней за ўсю гісторыю чэмпіянатаў Еўропы толькі аднаму футбалісту ўдалося забіць больш — у 1984 годзе будучы кіраўнік УЕФА француз Мішэль Платіні таксама на хатнім Еўра забіў дзевяць галоў.

Яшчэ пяцёра гульцоў у гісторыі чэмпіянатаў Еўропы забівалі па пяць мячоў: Марка ван Бастэн (1988), Алан Шырэр (1996), Патрык Клюйверт, Сава Мілошавіч (абодва — 2000-ы) і Мілан Бараш (2004).



## НАШЫ ІДУЦЬ ДАЛЕЙ

Мінскае «Дынама» і салігорскі «Шахцёр» выйшлі ў наступны раўнд Лігі Еўропы

**Мінчане пасля хатняй перамогі над латвійскім «Спартаком» (2:1) у Юрмале зноў перамаглі, гэтым разам з лікам 2:0. Галы на рахунку Уладзіміра Хвашчынскага і Махамеда Муніра. У другім крузе кваліфікацыі «Дынама» згуляе з ірландскім клубам «Сент-Патрыкс».**

У паядынку ў адказ стартавага круга на газоне салігорскага стадыёна «Будаўнік» гарнякі разграмілі фарэрскі «Рунавік» — 5:0. Першая гульня на Фарэрах таксама завяршылася перамогай «Шахцёра» з лікам 2:0. У другім раўндзе падапечныя Сяргея Нікіфарэнкі сустрэнуцца са славенскім «Домжале». Нагадаем, з другога раўнда ў барацьбу ўступіць і ўладальнік Кубка Беларусі жодзінскае «Тарпеда-БелАЗ», якое двойчы сустрэнецца з венгерскім клубам «Дэбрэцэн». Матчы другога круга Лігі Еўропы адбудуцца 14 і 21 ліпеня.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** lobazhevich@zviazda.by

# Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| ЛОТ 1 | |

**Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения**

1) капитальное строение, инв. № 420/С-4636 (назначение – здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей, наименование – здание санатория второй категории), площадью 2146,8 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123, санаторий «Радуга»;
2) капитальное строение, инв. № 420/С-54646 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – трансформаторная подстанция), площадью 46,7 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123/2, трансформаторная подстанция, санаторий «Радуга»;
3) капитальное строение, инв. № 420/С-44135 (назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – здание котельной), площадью 204,9 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123/3, котельная, санаторий «Радуга»;
4) капитальное строение, инв. № 420/С-37459 (назначение – здание специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения, наименование – здание спорткомплекса санатория «Радуга»), площадью 1824,7 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123/6, спорткомплекс, санаторий «Радуга»;
5) капитальное строение, инв. № 420/С-54648 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж на 2 автомашины со складом и навесом), площадью 460,5 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123/4, гараж, санаторий «Радуга»;
6) капитальное строение, инв. № 420/С-54647 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – овощехранилище), площадью 49,3 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123/1, овощехранилище, санаторий «Радуга»;
7) капитальное строение, инв. № 420/С-44134 (назначение – здание многоквартирного жилого дома, наименование – восьмиквартирный жилой дом), площадью 502,5 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123/5, жилой дом, санаторий «Радуга»;
8) капитальное строение, инв. № 420/С-55306 (назначение – сооружение специализированное транспорта, наименование – подъездная автодорога), площадью 0,0 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, подъездная автодорога к санаторию «Радуга»;
9) капитальное строение, инв. № 420/С-55097 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – очистные сооружения), площадью 0,0 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, в районе д. Докудово 2, очистные сооружения.
10) капитальное строение, инв. № 420/С-54776 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – сооружение благоустройства), площадью 0,0 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123, сооружение благоустройства, санаторий «Радуга»;
11) капитальное строение, инв. № 420/С-54932 (назначение – сооружение специализированное оздоровительного назначения, наименование – навес-площадка для летнего отдыха), площадью 0,0 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123, навес-площадка для летнего отдыха, санаторий «Радуга»;
12) капитальное строение, инв. № 420/С-54915 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – линия наружного освещения), протяженностью 1411,5 м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123, линия наружного освещения санатория «Радуга»;
13) капитальное строение, инв. № 420/С-55549 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – линия электропередачи 10 кВ), площадью 0,0 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, линия электропередачи к санаторию «Радуга»;
14) капитальное строение, инв. № 420/С-54918 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – тепловая сеть), протяженностью 322,3 м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123, тепловая сеть санатория «Радуга».
15) капитальное строение, инв. № 420/С-54916 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть ливневая), протяженностью 267,6 м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123, канализационная сеть ливневая санатория «Радуга».
16) капитальное строение, инв. № 420/С-54917 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть хозфекальная), протяженностью 769,8 м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123, канализационная сеть хозфекальная санатория «Радуга».
17) капитальное строение, инв. № 420/С-54919 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), протяженностью 478,3 м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123, водопроводная сеть санатория «Радуга»;
18) приставная горка РИМ-1 с 2-мя спусками, стела-указатель мф/лк1 3500, озеленение территории санатория (825 деревьев и 198 кустарников);
19) иное: камеры в/в КСО-366 (4 шт.), трансформатор ТМ-160/10 (1 шт.), шкаф ЗАК Щ 7671 А 712 (2 шт.), котел КВ-П-0,3-95 (1 шт.), пульт безопасности ПБКТ-1 (1 шт.), шкаф управления ШУ-РА 3213.000000.00..220 1р51 (1 шт.), машина уборочная МУ-320 (1 шт.), дизель-генераторная установка RID 130DS CABP (1 шт.), холодильник «Свияга» (1 шт.), холодильник «Минск-11» (1 шт.), аппарат УВЧ-66 (1 шт.), набор «Кремень» (1 шт.), набор «Баллада» (1 шт.), ковер 2х3 (1 шт.), ковер (1 шт.), сейф металлический (2 шт.), шкаф для одежды (4 шт.), весы ВТН-10 (1 шт.), счетчик СА (5 шт.), аппарат ультразвуковый УЗТ-101 (1 шт.), аппарат для СМВ-терапии «Луч-3» (1 шт.), аппарат «Ундатерм» УВЧ-80-3 (1 шт.), бильярд (1 шт.), вибрационный снаряд /тренажер/ (1 шт.), прибор «Амплипульс-5» (1 шт.), аппарат д/магнит ПДМТ-01 (1 шт.), дека профессиональная (1 шт.), компакт-проигрыватель (1 шт.), пульт микшерного ДМ-10 (1 шт.), усилитель мощности «Pilot» (1 шт.), акустическая система (2 шт.), прожектор «Кластер» (2 шт.), аппарат «Биоптрон PAG-890» (1 шт.), парафинонагреватель (1 шт.), ванна водолечебная вл (1 шт.), таксофон «Агат- 07» (1 шт.), холодильник «Минск 268» (1 шт.), пылесос «Samsung» (1 шт.), телевизор «Горизонт» (24 шт.), кусторез 240 r (1 шт.), проигрыватель LG 6000 (1 шт.), акустическая система BS 152 (2 шт.), усилитель «Sound king sk 612» (1 шт.), телевизор «Витязь» 63 ctv 6241 (1 шт.), эл. плита 4-х конфорн. 2140-2 (2 шт.), эл. плита настольн. энтш-5-2 «Гомельчанка» (1 шт.), телевизор «Витязь» (1 шт.), аппарат для очистки воздуха «Terapy air» (1 шт.), аппарат для электроакупунктуры «Zepter» (1 шт.), автоматическая система пожарной сигнализации здания санатория (1 шт.), электрокардиограф «Кардиовит ат-1» (1 шт.), пылесос промышленный (5 шт.), холодильник «Атлант» КШ-235/22 (3 шт.), холодильный шкаф ШВ-044-20 (1 шт.), витрина холодильная ВХС 030 (1 шт.), электроплита ПЭ-051 с вставкой (1 шт.), универсальная кухонная машина УКМ-06 (1 шт.), конвекционная печь ХВ 603g (1 шт.), массажер-стимулятор термотерапевтический: модель NM (1 шт.), телевизор «Горизонт» (4 шт.), холодильник МХТЭ-30-01-ХХ (4 шт.), ингалятор ультразвуковой «Альбедо» (1 шт.), устройство разогрева озокерита и парафина «Ратон» (1 шт.), ванна бальнеологическая «Гейзер» (1 шт.), мармит ПМЭС-78К-1-3 для первых блюд на 3 конфорки (1 шт.), радиомикрофон (1 шт.), аппарат компресс-терапии «Lympa-mat digital gradient» (1 шт.), устройство реабокс (1 шт.), душевая кафедра ДШ-2 (1 шт.), установка для восходящего душа увд (1 шт.), установка для циркулярного душа уцд (1 шт.), кушетка многофункц. км-11 (1 шт.), телевизор «Витязь» 32lc0 811-1т с кронштейном (1 шт.), кислородный концентратор серии 7f-3l (1 шт.), ванна бальнеологич. «Вулкан» вб00 (1 шт.), ванна-капсула harmony pro (1 шт.), травокосилка «Хускварна 143 r» (1 шт.), газонокосилка JET55S 5.5л (1 шт.), аппарат «Рефтон-01-ф-л-с» гт-смт+лазер (1 шт.), аппарат «Рефтон-01-ф-л-с» гт-ддт-лазер (1 шт.), косилка КСФ-2.1 б4 (1 шт.), полуприцеп ПСТ-3,5 (1 шт.), ингалятор «Бореал f400» (1 шт.), ингалятор «Бореал f400» (1 шт.), аппарат магнито-фототерапии фотоспок (1 шт.), телевизор «Горизонт» 32lcd840 (1 шт.), аппарат для приготовл. напитков PRO 60t (1 шт.), аппарат для приготовл. напитков PRO 40t (1 шт.), четырехкамерная ванна для рук и ног (1 шт.), устройство реабокс (1 шт.), оборудование для грязевых физиотерапевт. процедур fw4060e (1 шт.), ванна бальнеологическая «Вулкан» вб – 03 (1 шт.), станок деревообрабатывающий арс-511 (1 шт.), швейная машинка электрическая (1 шт.), компрессор с 415м (1 шт.), насос к 20/30 с эл. двигателем (1 шт.), видеомагнитофон (1 шт.), телевизор «Samsung» (1 шт.), телевизор «Горизонт» (16 шт.), биологическая очистительная установка (1 шт.), антенна (1 шт.), электропогрузчик ЕВ-687-28-22 (1 шт.), выпрямитель сварочный ВД-306у3 (1 шт.), тренажер (1 шт.), камера холодильная сборная КХС-2 (1 шт.), шкаф холодильный ШХ-0.8 м (1 шт.), станок заточной (1 шт.), холодильник «Стинол» (1 шт.), машина протирочная МПР-35м-02 (1 шт.), насос ЭЦВ 6-10 (1 шт.), вентилятор ВО 06-300 №5 (1 шт.), котел водогрейный КВ-РТ-0,5-95 (1 шт.), котел стальной водогрейный КВ-0,93 (кд) (1 шт.), дымосос ДН-3,5 (1 шт.), теплообменник ТАР -0,15-14.1 с обвязочной схемой (1 шт.), насос sta-rite onga 800-e series (1 шт.), кофемашина (1 шт.), бензопила Н-365 15 (1 шт.), машина кухон универсал УКМ-П (1 шт.), плита электр. пром. ПЭМ6-010 (1 шт.), сковорода электр. секцион. СЭС-0,55 (1 шт.), шкаф холод. СМ114-s (1 шт.), машина посудомоечн. МПУ-700-01 (1 шт.), вентилятор ВД-1,6 (2 шт.), дымосос Д-2,8 (1 шт.), осушитель воздуха «Master dh 62» (1 шт.), насос «Sena» (1 шт.), холодильник МХТЭ 30-01-60 (2 шт.), шкаф-витрина шву-0.4-1.3-20 (1 шт.), холодильник МХ-365-00 (1 шт.), кусторез бензиновый «Efco» (1 шт.), мотопомпа ВНБ 100 (1 шт.), горизонтальный морозильный ларь GTE 3702 (1 шт.), аппарат кассовый ЭКР-3110-ф (1 шт.), весы электронные «Меркурий» 315 (1 шт.), аппарат электротерапии «Радиус-01» (1 шт.), пожарная сигнализация и система оповещения людей о пожаре физкультурно-оздоровительного комплекса санатория «Радуга» (1 шт.), пожарная сигнализация и система оповещения людей о пожаре 8-квартирного жилого дома (1 шт.), теплосчетчик ТЭМ-104-1 (1 шт.), теплосчетчик ТЭМ-104-2 (1 шт.), расходомер РСМ 05.03 ДУ-100 (1 шт.), платежный терминал «Hypercom optimum» t4210 (1 шт.), компьютер «Belsoft» (1 шт.), компьютер «Астлайн» (1 шт.), телефакс KX FT 902 RU (1 шт.), принтер hp 1320 (1 шт.), пэвм сильверадо (1 шт.), ноутбук «Asys» (1 шт.), локальная компьютерная сеть санатория «Радуга» (1 шт.), стерилизатор (2 шт.), комплект массажных кушеток (1 шт.), облучатель ОБН-150 (2 шт.), холодильник «Минск-212» (1 шт.), стол теннисный (2 шт.), музыкальный центр AS-135 (1 шт.), бильярд (1 шт.), комплект спортивных тренажеров (1 шт.), спальня «Мара» (1 шт.), набор корпусной мебели «Молодечно» (1 шт.), кухонный гарнитур «Барокко» (1 шт.), тренажер «Старт» (1 шт.), велотренажер 5450 (1 шт.), набор мягкой мебели (1 шт.), ковер 2х3 (1 шт.), ковер 3х5 (1 шт.), ковер 2,5х3,55 (1 шт.), комплект кухни (1 шт.), набор мебели для спальни «Глория» (1 шт.), набор мягкой мебели (2 шт.), кухонный комбайн «Philips» (1 шт.), печь СВЧ «Daewoo» (1 шт.), фритюрница «Philips» (1 шт.), набор корпусной мебели «Крокус» (1 шт.), мягкая мебель «Светлана» (1 шт.), набор кухонной мебели «Речица» (1 шт.), набор корпусной мебели «Полесье» (1 шт.), набор угловой мебели «Янтарь» (1 шт.), набор мебели «Александрия» (1 шт.), барная стойка (1 шт.), набор мягкой мебели «Янтарь» (1 шт.), шкаф 1000*600*2000 (1 шт.), шкаф 1175*600*1850 (1 шт.), шкаф-купе (18 шт.), диван «Изабель» 2 3м тк8 (2 шт.), диван-кровать 3-х местный (7 шт.), диван «Мичиган» 3 м (1 шт.), шкаф 3-х дверн. «Венеция» (1 шт.), шкаф с витриной «Венеция» (1 шт.), тумба «Венеция» (1 шт.), стол 2-х тумб. «Венеция» (1 шт.), кровать 2-х спальн «Верди» (1 шт.), шкаф с витр. «Верди» (2 шт.), шкаф 3-х «Верди» (1 шт.), н-р д/кухни «Стелла» (6 шт.), стол обеден верди (1 шт.), кровать «Венеция» (1 шт.), диван «Изабель» (2 шт.), диван «Изабель» 2 2м тк 663 (10 шт.), м/м «Бари» (1 шт.), м/м «Хилтон» (2 шт.), диван «Мичиган» (3 шт.), стол туалет «Венеция» (1 шт.), м/м «Моника» (1 шт.), диван «Изабель» 2 2м тк 663 (1 шт.), шкаф с витриной «Венеция» (1 шт.), шкаф*-купе 1910*430*2300 (1 шт.), шкаф-купе 2500*650*2300 (1 шт.), «Барьер 1» (1 шт.), «Барьер 2» (1 шт.), к/м медео-2син 15 набор (1 шт.), диван угл. «Хилтон» 3ml90r кожа 4060 (1 шт.), буфет-бар «Викинг» gl-05/01 (1 шт.), электрокамин «Viana» (1 шт.), фонтан керам., иск, в комп., в кашпо (1 шт.), шкаф «Ника» п 024 536 (венге) (1 шт.), уличная светодиодн конструкция LED-EM-003-12v (1 шт.), уличная светодинамическая конструкция LED-EM-003 (1 шт.), лавка угловая 1500*1450 с надстройкой (1 шт.), к-т мебели д/стол-ой 2730*460*11609 (стойка раздвижная-постформинг) (1 шт.), к-т кухонный (стол 800*800*730-1 шт и 4 стула) (3 шт.), шкаф-купе 1400*650*2200 (1 шт.), к-т мебели д/гардеробной 2300*570*2000 (вешалка стеновая) (1 шт.), перфоратор GBH 2-26 DFR 800 вт (1 шт.), агрегат электронасосный ЭЦВ 6-6,5-90 (1 шт.), аквапалка (8 шт.), акустика ДБЛ (1 шт.), акустич. кабель CLS 216 (20 шт.), акустич. система Behrinher b215xl (1 шт.), аппараты (7 шт.), багажница (2 шт.), бак пластик пед 17л бел (8 шт.), баллон углекислотный (16 шт.), банкетка (15 шт.), бант на стул (112 шт.), бензопила Н-365 (1 шт.), блюдце 14 см «Empilable (58 шт.), блюдо д/запекания керам. 21*12м (6 шт.), ботинки лыжные (12 шт.), бочки (2 шт.), вазы (92 шт.), вазон д/цветов (14 шт.), ванна (6 шт.), ведра (143 шт.), велосипед (10 шт.), вентилятор (8 шт.), весы (7 шт.), вешалка (58 шт.), ведро (2 шт.), внешняя антенна (1 шт.), воздухоочистители (3 шт.), выпрямители (2 шт.), гантели (7 шт.), гастроемкость (11 шт.), гвоздодер (1 шт.), гиря (2 шт.), гном с лампой (1 шт.), горшок (65 шт.), грабли (8 шт.), графин для вина (1 шт.), двд (1 шт.), декор изделие «Зубр» (2 шт.), держатели (51 шт.), диваны (16 шт.), диспенсеры (37 шт.), дозаторы (28 шт.), домино (1 шт.), дорожки (110 шт.), доски (12 шт.), душевая кабинка (2 шт.), дымосос д-2,8 (1 шт.), емкости (11 шт.), жалюзи (172 шт.), заземление для распред. уст-ва (1 шт.), замки (6 шт.), зелень искусственная (1 шт.), зеркало (36 шт.), зеркальный шар (1 шт.), зубило (1 шт.), информационный щит (1 шт.), искусст. растение (6 шт.), кабинка душ (1 шт.), карниз (109 шт.), картина (16 шт.), картофелечистка (1 шт.), кастрюли (34 шт.), каталка детская (5 шт.), каток гим (5 шт.), кашпо (29 шт.), кий бильярдный (5 шт.), кирпич ША-5 (1 шт.), клавиатура Chikony 9810 MB 104 keys ps/2 black (1 шт.), ключи (5 шт.), ключница (1 шт.), клюшки (8 шт.), ковер (27 шт.), коврик (26 шт.), комод (3 шт.), комплект д/спальни (12 шт.), комплект для туалета (6 шт.), комплект штор (110 шт.), контейнеры (126 шт.), контролер cl-2 для 5-ти приводн белт-лайта (1 шт.), коньки (14 шт.), корзина для мусора (34 шт.), котлы (14 шт.), кофеварка (2 шт.), кофейная пара 100 см³ мокко (60 шт.), крепление лыжное жесткое (21 шт.), кресло (31 шт.), кровати (92 шт.), кронштейн-5020 (1 шт.), круг шлиф (4 шт.), кса орион 100-ф (1 шт.), кувшин (4 шт.), куст искусственный в кашпо (1 шт.), кушетка (16 шт.), ладья малая камыши хр (6 шт.), ламбрекен (12 шт.), лампа на сол/бат хром 40 см (4 шт.), лежак set concerto белый (3 шт.), лейка (1 шт.), лестница (5 шт.), лилия искусственная (7 шт.), лист кровельный (еврошифер) красн. (2*0,95) (2 шт.), ложка стол. (67 шт.), лопаты (22 шт.), лотки (19 шт.), лыжи (17 шт.), магнитола (1 шт.), массажер (26 шт.), матрац (22 шт.), механизм цилиндровый Л-60 (3 шт.), микроволновая печь (2 шт.), микросистема «Samsung» мм-с430 (1 шт.), микрофоны (11 шт.), микрофонный кабель смк 222 (40 шт.), миксер коктейлер (1 шт.), микшерный пульт (2 шт.), миска (4 шт.), многофункциональное устройство (2 шт.), модули (1270 шт.), мойка (3 шт.), монитор 17 Samtron (1 шт.), моноблок (2 шт.), морозильник М-7184-000 «Атлант» (1 шт.), москитная сетка (137 шт.), мыльница (27 шт.), мышь Chikony MS-0601p optical ps/2 black (1 шт.), мягкий уголок (1 шт.), мячи (6 шт.), набор бит (3 шт.), набор ключей (1 шт.), набор меб. для прихожей (1 шт.), набор мисок (5 шт.), набор отверток (1 шт.), набор рюмок (27 шт.), набор салатников (1 шт.), набор сверл (2 шт.), набор стаканов (60 шт.), набор фужеров (25 шт.), набор чашек с блюдцем (1 шт.), набор шампанок (2 шт.), набор шаров бильярдн. (1 шт.), набор шестигранных ключей (1 шт.), набор д/чая (1 шт.), наволочка (24 шт.), нагреватель электр mast (2 шт.), надфиль н-р (1 шт.), накопитель usb (3 шт.), напольное покрытие (42 шт.), насосы (6 шт.), настолешница (122 шт.), нож столов. (253 шт.), ножницы по мет 250 (1 шт.), ножовка по дер 500 (1 шт.), н-р сверл (1 шт.), нумератор (1 шт.), облучатели (2 шт.), обогреватели (7 шт.), огнетушители (29 шт.), ограждение библиотеки (1 шт.), одеяло (60 шт.), опрыскиватель РЖ-12 (1 шт.), отвертки (3 шт.), палки д/ходьбы (18 шт.), палки лыж (21 шт.), панель зеркальн /1500*700/ (1 шт.), пепельница нерж сталь (3 шт.), перегородки (2 шт.), печать r40 (1 шт.), печь микр. (11 шт.), печь-каменка (1 шт.), пилы (3 шт.), пистолет д/пены (1 шт.), плакат на банере 2000*1000 мм (1 шт.), планка с 4 крючками мет. (10 шт.), планшет на пвх (7 шт.), плинтус (186 шт.), плита напольная (2 шт.), плоскогубцы 160 (1 шт.), поддон эмалир. (1 шт.), подносы (61 шт.), пододеяльник 1,5-сп. (24 шт.), подсвечник мет. (13 шт.), подставки (4 шт.), подушка (112 шт.), покрывало (66 шт.), покрытие ковровое пошив с печат. рисунком (19,5 шт.), полки (9 шт.), полотенце (1180 шт.), прибор «Пеленг вк 04» (1 шт.), прибор алкотест 203 (1 шт.), принтер Xerox (1 шт.), прихожая (1 шт.), прожектор par 36 (1 шт.), проигрыватель dvd (1 шт.), простынь (80 шт.), ПЭВМ «Катран» (2 шт.), радиомикрофон (1 шт.), ракетки (4 шт.), раковина (1 шт.), регулятор темп. РТ-2000а-0 (1 шт.), репр. картин 40*50 (1 шт.), рецепты провославной кухни (1 шт.), решетка вент. (20 шт.), рубанок 1200 ВТ (1 шт.), рукав пож напор «Престиж» 51-1,0-оп-пк-рс-13 (4 шт.), рыбница (3 шт.), салатница (292 шт.), салфетки (538 шт.), сборники (6 шт.), светильник (31 шт.), светоф. с прив par 36 (1 шт.), сейф металлический (1 шт.), секатор кусторезн (1 шт.), селедочница (25 шт.), сервизы (2 шт.), сетка б/тен (1 шт.), система охран. сигнализ. сан. «Радуга» (бухг., буфет, скл. мед.) (1 шт.), скамейка (38 шт.), скатерть (102 шт.), сковорода (3 шт.), совок д/мус (4 шт.), сплит-система SM111S (1 шт.), стаканы (783 шт.), стеллаж (4 шт.), степлер №24 (2 шт.), стереомагнитола (2 шт.), стиральная машина СМА 60с87-000 (1 шт.), стойка (6 шт.), столы (212 шт.), стробоскоп (1 шт.), стулья (483 шт.), сувенир-термометр «Малыш» (2 шт.), сундук «Викинг» (1 шт.), супница нерж. 2,0 л (22 шт.), сухарница (25 шт.), сушилка д/б нап (12 шт.), счетчики (4 шт.), табличка (53 шт.), табурет (92 шт.), тазы (12 шт.), тарелки (290 шт.), тахта (1 шт.), телевизоры (21 шт.), тележки (5 шт.), телеск ручка для сквиджей д/пола 150 4503004 (8 шт.), телеф.аппар. (2 шт.), термовоздуховод gh 6 660 Ice (1 шт.), термос (8 шт.), ткань стеклян. 9т40u092 т-13пм(100) (190 шт.), топор 2,2 кг (1 шт.), тортница (8 шт.), точка доступа DWL-2100AP (5 шт.), трансформаторы (4 шт.), тумбы (137 шт.), тюли (7 шт.), углшлифмашина (1 шт.), удлинитель (14 шт.), умывальники (2 шт.), унитаз (1 шт.), уничтожитель насекомых (1 шт.), усилитель мощности (2 шт.), уст-ка компрессорная СБ4-8.F114K (1 шт.), утюги (3 шт.), фен электр (2 шт.), холодильники (34 шт.), чайная пара (77 шт.), чайник элек. (5 шт.), часы (14 шт.), чашки (64 шт.), чехлы на стулья (130 шт.), шары бильярдные (1 шт.), шкафы (115 шт.), штампы (6 шт.), шторы (43 шт.), щетка д/туалета с чашей 170*710 бел (7 шт.), щеточное оборудование в комплекте к МТЗ-320 (1 шт.), щиты информации (70 шт.), эл. чайник (17 шт.), эл. дрель (2 шт.), эл. чайники (16 шт.), эл. шинковка-терка ЭТБ-2М (1 шт.), электроводонагреватель ЭВАД-10/1,6 (1 шт.), электрокипятильник ЭКГ-100 (1 шт.), электролобзик (1 шт.), электромиксер ЭМ Р-205 (1 шт.), электромясорубка (1 шт.), электрорадиатор «Ясельда» (12 шт.), электросушитель д/рук (2 шт.).

| | |
|---|---|
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | 1) Кадастровый номер 423685402526000194 (назначение – для обслуживания очистных сооружений), площадью 1,2499 га, расположенном по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, в районе д. Докудово 2, очистные сооружения.<br>2) Кадастровый номер 423685402526000195 (назначение – для обслуживания канализационно-насосной станции), площадью 0,0050 га, расположенном по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, в районе д. Докудово 2, канализационно-насосная станция.<br>3) Кадастровый номер 423683500028000004 (назначение – для обслуживания санатория второй категории «Радуга»), площадью 4,6196 га, расположенном по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123, санаторий «Радуга».<br>4) Кадастровый номер 423685400026000022 (назначение – для обслуживания подъездной автомобильной дороги), площадью 1,2225 га, расположенном по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, в районе д. Докудово 2 |
| **Начальная цена продажи** | 4 024 228 (четыре миллиона двадцать четыре тысячи двести двадцать восемь) рублей с НДС |
| **Сумма задатка** | 402 422,80 р. (четыреста две тысячи четыреста двадцать два рубля восемьдесят копеек) |
| **Условия аукциона** | возмещение ОАО «Лакокраска», г. Лида, затрат на проведение независимой оценки имущества в размере 16 470 рублей с учетом НДС |
| **Продавец** | ОАО «Лакокраска», г. Лида, 231300, г. Лида, ул. Игнатова, 71, тел./факс 8-0154-52-27-55 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 10 августа 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

